Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 116 (5790) | 22 мая 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Бліскучая перамога совецкіх палярнікаў.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ «ПРАВДЫ» — Рашуча палепшыць работу Асоавіяхіма.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Рыхтавацца да выбараў профсаюзных органаў.
Пастанова Совета Народных Камісараў БССР — Аб будаўніцтве школы ў Журавіцкім раёне.
У ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА: **А. Ю. Стульба, Н. Е. Куневі́ч** — Задачы лясной прамысловасці БССР у трэцяй пяцігодцы; **Г. Л. Локшын** — Пабудуем у Беларусі суконны камбінат.
Мулярчык, Апрэлеў — Акруговыя суды і іх задачы.
На партыйных канферэнцыях.

ЗА РУБЯЖОМ:
Тэлеграма іспанскага ўрада Ліге Нацый;
Іспанскі народ падтрымлівае новы ўрад;
Мерапрыемствы новага іспанскага ўрада;
Працоўныя Францыі дапамагаюць басскам;
Канфлікт паміж японскім урадам і грамадскасцю;

РЫХТАВАЦЦА ДА ВЫБАРАЎ ПРОФСАЮЗНЫХ ОРГАНАЎ

З 1 чэрвеня пачынаюцца выбары профсаюзных органаў. Асноўная асаблівасць гэтых выбараў заключаецца ў тым, што яны будуць праводзіцца на аснове закрытага, тайнага галасавання. Парадак выбараў, распрацаваны пленумам ВЦСПС, забяспечвае разгортванне шырокай дэмакратыі, арганізаванасці выбараў, найбольшае задавальненне правоў членаў профсаюза.

Да выбараў усе прафорганы знізу даверху будуць рабіць справаздачу аб сваёй рабоце.

У аснову справаздач трэба палажыць указанне пленума ВЦСПС, што: «Без выкрыцця ўсіх недахопаў у рабоце профсаюзаў, без упарытай барацьбы з палітычнай пасіўнасцю і блізарукасцю, з коснасцю і бюракратызмам прафорганаў немагчыма выпраўленне гэтых недахопаў, правядзенне сапраўднага дэмакратызма ў профсаюзах і паварот у рабоце профсаюзаў у адпаведнасці з новымі ўмовамі і задачамі».

Совецкая краіна ажыццяўляе сур'ёзны палітычны паварот, які выклікан Сталінскай Канстытуцыяй. У гэтых умовах невымяральна вырастае роля профсаюзаў у справе развіцця социялістычнай дэмакратыі і ўмацавання дыяржаўнага кіраўніцтва грамадствам. Сталінскай Канстытуцыяй прафесіянальным арганізацыям прадстаўлена права вылучаць сваіх кандыдатаў на выбарах у советы дэпутатаў працоўных.

Гэту ролю профсаюзы выканаюць толькі тады, калі яны перамогуць адставанне ад тэмпаў социялістычнага будаўніцтва, усвядомяць характар новай абстаноўкі і сваіх новых задач ва ўмовах павароту ў палітычным жыцці краіны, калі яны перамогуць перажываемы імі своеасаблівы крызіс.

Ліквідацыя гэтага адставання профсаюзаў немагчыма без большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі знізу ўсіх недахопаў работы профорганаў. Жывы голас мас, самакрытыка, разгорнутая дэмакратыя неабходны цэмер профсаюзам як паветра для жывога арганізма.

Профсаюзы Беларусі скрозь і ўсюды ўшчамлялі правы членаў саюза, парушалі прынцыпы выбарнасці профарганізацый, шырокія масы членаў саюза не прыцягваліся да абмеркавання хвалюючых іх пытанняў, актыў не выхоўваўся.

Пачынаючы ад ЦСПСБ і цэнтральных праўленняў саюзаў і да нізавых камітэтаў груба парушалася профсаюзная дэмакратыя. Апошнія выбары ЦСПСБ былі ў 1932 годзе. За гэты час склад яго некалькі разоў змяняўся, абраных з'ездам членаў прэзідыума ЦСПСБ асталося толькі 3 чалавекі. Кіраўнікі ЦСПСБ перасталі нават склікаць пленумы — апошні пленум ЦСПСБ адбыўся ў 1935 годзе. Старшыня цэнтральнага праўлення саюза швейнікаў, БРК саюза лесу і сплаву і некаторыя іншыя кіўм не абіраліся.

Не лепшае становішча і ў нізавых профарганізацыях. Нядаўна на заводзе імя Молатава (Менск) начальнік сушыльнага цэха Рукавец прызначыў прафоргам цэха рабочага Стацэвіча. Характэрна, што ні заўком, ні партком гэтаму не пярэчылі.

Канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва глыбока ўкараніліся ва ўсіх звеннях профсаюзнага апарата. Яны прывыклі апірацца выключна на платны апарат і перасталі прыцягваць да работы вялікую армію выбарных профсаюзных актывістаў.

Растучыя запатрабаванні мас не задавальняюцца профсаюзнымі арганізацыямі, яны мала дапамагаюць вялікаму стаханаўскаму руху. Яркім прыкладам адставання профсаюзаў і адрыву прафорганаў Беларусі ад мас з'яўляецца той факт, што профсаюзныя кіраўнікі не толькі не вылучаюць новых выдатных людзей у совецкія і іншыя органы, але і для ўласнай работы не могуць знайсці новых кадраў, не бачаць іх.

Палітычную пасіўнасць і бесклапотнасць, ратаўніцтва профсаюзных арганізацый у радзе месц скарыстаў вораг для сваёй шкодніцкай работы. Толькі гэтым можна вытлумачыць, што пад носам ЦСПСБ банда злодзеяў на працягу чатырох год раскрадала сродкі социяльнага страхавання і была выкрыта апрача профсаюзаў.

Усё гэта павінна быць з усёй рэзкасцю раскрытыкавана на справаздачна-выбарчых сходах. Няма ніякага сумнення, што шырокія масы членаў саюза, якія гараць жаданнем палепшыць работу сваіх профсаюзаў, здолеюць ускрыць усе балячкі ў рабоце профсаюзаў Беларусі і актыўна дапамогуць ім уключыцца ў агульны палітычны паварот.

Пры новай сістэме выбараў на аснове тайнага галасавання мільённыя масы членаў саюза аддадуць свае галасы лепшым людзям фабрык і заводаў, тым, каму яны вераць, каго яны паважаюць. Усе негодныя, абюракраціўшыяся, адарваныя ад мас профработнікі будуць выкінуты за борт профсаюзнай работы, на іх месца прыйдуць новыя, выдатныя людзі, якімі так багаты рабочы клас краіны социялізма.

Сістэма выстаўлення і абмеркавання кандыдатур, пры якой кожнаму члену саюза прадастаўлена неабмежаванае права адводу кандыдатур, забарона галасавання спісам, забарона падмяняць агульныя сходы канферэнцыямі для выбараў, абавязковае, за 10 дзён, папярэджанне профсаюзнай масы аб парадку схода — усё гэта дае магчымасць правесці выбары з максімальнай арганізаванасцю. Але арганізаванасць не прыдзе сама ў парадку самацёку. Для гэтага патрабуецца, каб рашэнні пленума ВЦСПС былі даведзены да сазнання абсалютна кожнага члена саюза. Задача профсаюзных арганізацый неадкладна, не чакаючы асобных дырэктыў, узяцца за сур'ёзнае растлумачэнне члэнам саюза найвялікшага палітычнага значэння прадстаячых выбараў, іх сістэмы, тэхніку і т. д.

Вялікая і адказная задача партыйных арганізацый як у арганізацыі дзелавой работы справаздачных сходаў, так і правядзення выбараў. Кіруючая роля комуністаў на гэтых сходах, як і ва ўсёй штодзённай рабоце профсаюзаў, павінна быць асабліва узнята. Трэба пакончыць з такімі фактамі, калі паасобныя комуністы зняважліва адносяцца да работы ў профсаюзах. Можна прывесці не мала фактаў, калі партыйныя арганізацыі не толькі не дапамагалі профарганізацыям, але і зводзілі нанішто іхнія невялікія ў рабоце пачынанні. На бабруйскім лесакамбінаце, напрыклад, заўком узняў пытанне аб барацьбе з траўматызмам, у заводскай партыйнай арганізацыі ён не знайшоў падтрымкі і вымушан быў звярнуцца за дапамогай у райком, але і там ён падтрымкі не знайшоў. На рагачоўскім лесазаводзе партыйная арганізацыя без ведама прафарганізацыі перахідвае старшыню заўкома на іншую работу. Член заўкома бабруйскага лесакамбіната — комуніст Астанавіцкі адмаўляецца выконваць даручэнні заўкома. Кожны комуніст павінен памятаць, што тайныя выбары профорганаў з'яўляюцца экзаменам для партыйнай арганізацыі, праверкай аўтарытэтнасці яе і кожнага комуніста ў масах. Комуніст павінен быць важаком і кіраўніком профсаюзнай арганізацыі. Кожны комуніст — актыўны ўдзельнік профсаюзнай работы.

На справаздачна-выбарчых сходах вораг пастараецца дзе-ні-дзе навесці паклёп на нашы профсаюзы, скампраметаваць чесных профсаюзных работнікаў, а ў радзе месц ён будзе стараццца прабіцца ў выбарчыя прафорганы. Партыйныя і профсаюзныя арганізацыі павінны быць гатовы да гэтага, трэба ўмець адрозніць варожае выступленне. Забяспечыць кіраўніцтва сходамі, дапамагчы шырокім масам рабочых распазнаць ворага, мабілізаваць іх пільнасць — баявая задача партыйных арганізацый.

Шлях перабудовы работы профсаюзаў вызначан. Цяпер задача — давесці рашэнні пленума ВЦСПС да кожнага члена саюза, да кожнай нізавой арганізацыі, па-баявому рыхтавацца да справаздач і выбараў прафорганаў.

БЛІСКУЧАЯ ПЕРАМОГА СОВЕЦКІХ ПАЛЯРНІКАЎ

ЦК ВКП(б)—таварышу І. В. СТАЛІНУ СОЎНАРКОМ СССР—таварышу В. М. МОЛАТАВУ

Паведамляем атрыманую праз радыёстанцыю вострава Дзіксон радыёграму:

«Масква, «Главсевморпуть» Янсону, Бергавінаву.

Востраў Рудольфа Шэвелёву.

У 11 гадзін 10 мінут самалёт «СССР Н-170» пад кіраваннем Вадап'янава, Бабушкіна, Спірына, старшага механіка Басейн праляцеў над Паўночным полюсам.

Для страхоўкі прайшлі яшчэ некалькі далей. Затым Вадап'янаў знізіўся з 1.750 метраў да 200, прабіўшы суцэльную воблачнасць, сталі шукаць крыгу для пасадкі і пабудовы навуковай станцыі.

У 11 гадзін 35 мінут Вадап'янаў бліскуча зрабіў пасадку. На жаль, пры адпраўцы тэлеграмы аб дасягненні полюса раптам здарылася кароткае замыканне. Выбыў умформер рацыі, спынілася радыёсувязь, якая аднавілася толькі зараз, пасля ўстаноўкі рацыі на новай палярнай станцыі. Крыга, на якой мы спыніліся, размешчана, прыкладна, за 20 кілометраў за полюсам па той бок і некалькі на захад ад мерыдыяна Рудольфа. Становішча ўдакладнім. Крыга поўнасцю прыгодна для навуковай станцыі, якая астаецца ў дрэйфе ў цэнтры палярнага басейна. Тут можна зрабіць бліскучы аэрадром для прыёмкі астатніх самалётаў з грузам станцыі.

Адчуваем, што перарывам сувязі мімаволі прычынілі вам шмат непакою. Вельмі шкадуем. Сардэчнае прывітанне.

Прашу далажыць партыі і ўраду аб выкананні першай часткі задання.

Начальнік экспедыцыі ШМІДТ».
В. а. начальніка «Главсевморпути» Н. ЯНСОН.
Начальнік паліткіраўніцтва С. БЕРГАВІНАЎ.

ЛЮДЗІ МАЙГО АТРАДА

(Гутарка з героем Совецкага Саюза— камандзірам атрада самалётаў— М. В. Вадап'янавым)

У сярэдзіне мінулага года ўрад даручыў «Главсевморпути» арганізаваць высокашыротную экспедыцыю на самалётах. У задачу экспедыцыі ўваходзіла: дасягнуць Паўночнага полюса, зрабіць пасадку і пакінуць на дрэйфуючым ільду групу вучоных на чале з вядомым палярнікам, ордэнаносцам І. Д. Папаніным.

Высадзіўшы зімоўшчыкаў на полюс і забяспечыўшы іх усім неабходным для жыцця і правядзення навуковых наглядання па загадзя распрацаванаму комплексу, асноўныя самалёты экспедыцыі вернуцца ў Маскву. Адзін з іх — цяжкі чатырохматорны паветраны карабель «АНТ-6» пад кіраваннем пілота І. П. Мазурука — астаецца на востраве Рудольфа — самым паўночным з астравоў Зямлі Франца-Іосіфа. Мазурук мае заданне трымаць безупынную сувязь з зімоўкай і па першаму патрабаванню аказаць ёй дапамогу з паветра, а пасля скančэння тэрміну зімоўкі, прыкладна, праз год, зняць групу тав. Папаніна з полюса і даставіць яе ў Маскву.

Вось каротка, да чаго зводзіліся задачы, пастаўленыя перад намі ўрадам. Для выканання гэтых задач урад прадставіў у наша распараджэнне 4 цяжкія самалёты «АНТ-6».

На працягу поўгода мы з дапамогаю рабочых завода імя Гарбунова пераабсталявалі атрыманыя намі самалёты серыйнай вытворчасці, прыстасаваўшы іх для палётаў у цяжкіх умовах высокіх шырот Арктыкі.

Паралельна з падрыхтоўкай матэрыяльнай часткі Кіраўніцтва палярнай авіяцыі «Главсевморпути» займалася самым складаным пытаннем маючай быць экспедыцыі — падборам лётных кадраў.

З самага пачатку стала вядома, што ў экспедыцыю пойдуць толькі лепшыя людзі палярнай авіяцыі, паказаўшыя на практыцы высокі клас авалодання тэхнікай лётнага майстэрства, маючыя вялікі вопыт работы ў Арктыцы.

Камандзірам першага карабля ў экспедыцыі, і разам з тым камандзірам усяго атрада цяжкіх самалётаў, якія накіроўваюцца на полюс, быў назначан я. Разам са мною на маім самалёце ляцяць: вядомы палярны пілот—ордэнаносец М. С. Бабушкін, флаг-штурман экспедыцыі — ордэнаносец маёр І. Т. Спірын, радзіст экспедыцыі — чэлюскінец С. А. Іваноў, мой стары лётны спадарожнік—борт-механік Ф. І. Басейн і яго памочнік П. П. Пеценін. Тав. Спірын шырока вядомы ў нашай краіне, як удзельнік пералёту героя Совецкага Саюза М. М. Громава. У верасні 1934 года яны праляцелі на совецкай машыне «РД» 75 гадзін без пасадкі, пакрыўшы адлегласць у 12.411 кілометраў.

Роля тав. Спірына ў нашым пералёце надзвычай вялікая. Востраў Рудольфа будзе апошняй зямлёй на нашым шляху. Далей, за 82-м градусам паўночнай шырыні, як думаюць вучоныя ўсяго свету, няма ні аднаго кавалачка сухазем'я. Гэтаму сцвярджэнню прыходзіцца верыць на слова, бо высокія шыроты Арктыкі да гэтага часу астаюцца мала даследаванымі або зусім недаследаванымі.

Такім чынам, без карт, не маючы ні аднаго арыентыра, флаг-штурману нашай экспедыцыі тав. Спірыну трэба будзе прывесці самалёты да самага пункта Паўночнага полюса, дакладна вызначыўшы яго з паветра. У палёце яму прыдзецца карыстацца адзіным металам ваджання самалёта — астранамічнай арыентыроўкай, г. зн. арыентыроўкай па становішчу нябесных свяцілаў.

Камандзір другога карабля экспедыцыі — герой Совецкага Саюза В. С. Молакаў. Разам з ім ляцяць палярны пілот Г. К. Орлоў, пастаянны спадарожнік тав. Молакава ордэнаносны штурман — радзіст А. А. Рытсланд, борт-механікі тт. Б. Л. Івашын і Фрутэйкі.

Тав. Івашын параўнаўча нядаўна працуе ў палярнай авіяцыі, але ўжо вельмі шырока вядомы. У 1934 годзе ён разам з лётчыкам Рабенка вёў новую морскую машыну «Дорн'е-Валь-10» з Ленінграда ў Арктыку. Гэта быў рызыкоўны рэйс на яшчэ неаблятанай машыне. Лётчык Рабенка тады ў барацьбе з туманам расходаваў увесь запас гаручага над Карскім морам і вымушан быў сесці на ваду недалёка ад заліва Гыда-Ямо. Разам з пасажырамі пілот пайшоў шукаць чалавечае жыллё. Дасягнуўшы бліжэйшай фактэрыі, тав. Рабенка захварэў. На самалёце астаўся адзін тав. Івашын, ён ахоўваў машыну, пакуль не ўдалося вывесці яе на бязпечнае месца. Дзякуючы самаадданасці тав. Івашына, самалёт «Дорн'е-Валь-10» да гэтага часу лятае на нашых палярных лініях і ходзіць на лёдавыя разведкі.

Трэцім караблём камандуе палярны пілот ордэнаносец А. Д. Алексеў. Перш чым стаць пілотам, тав. Алексеў доўгі час працаваў штурманам. Набыты вопыт дапамагае яму дасканала арыентавацца пры самых цяжкіх метэаралагічных умовах Запаляр'я.

Разам з тав. Алексеевым ляцяць другі пілот М. І. Казлоў, штурман-радзіст Н. М. Жукаў, борт-механік К. Н. Сугробаў і І. Д. Шмандзін.

4-ая машына (рэзервавая) ідзе пад камандаю пілота І. П. Мазурука. У складзе экіпажа гэтага самалёта палярны пілот Л. Г. Крузе, які будзе начальнікам лётнай базы экспедыцыі, штурман-радзіст В. І. Акуратаў, які прымаў ужо ўдзел у леташнім пералёце Масква — Зямля Франца-Іосіфа, борт-механік Ян Брэзін і Екураў.

З тав. Мазуруком, як з лётчыкам, мне ўпершыню прышлося сустрэцца ў 1931 годзе. Я ў той час лятаў на далёкаўсходняй паштовай лініі Хабараўск — Сахалін. Тав. Мазурук, толькі скончыўшы лётную школу, прыняў у мяне гэту лінію і паспяхова працаваў на ёй бязпеменна 6 год. За добрую работу на труднейшай лініі Мазурук узнагароджан Ордэнам краснай звязды.

Такавы кадры нашай экспедыцыі. Кожны з членаў экіпажа мае велізарны вопыт палёту за палярным кругам, а ўсе разам яны з'яўляюцца носьбітамі лепшых традыцый усёй палярнай авіяцыі нашай радзімы.

Начальнікам экспедыцыі на Паўночны полюс зацверджан акадэмік О. Ю. Шмідт. Яго намеснікам па лётнай частцы, начальнік палярнай авіяцыі «Главсевморпути» ордэнаносец М. І. Шэвелеў.

***

Высокашыротная экспедыцыя, як і ўсякая вялікая справа, мае сваю гісторыю. Зімоўка на полюсе была задумана даўно. О. Ю. Шмідт яшчэ ў 1935 г. даручыў мне скласці тэхнічны праект высадкі навуковай экспедыцыі ў сэрцы Арктыкі.

Для таго, каб добра выканаць гэта заданне, Отто Юльевіч параіў мне злятаць на Зямлю Франца-Іосіфа, падняцца да 83—84 паралелі, азнаёміцца на практыцы з лёдавай і метэаралагічнай абстаноўкай у гэтых шыротах. Гэту задачу я і выканаў, робячы леташні пералёт на Зямлю Франца-Іосіфа. Пасля гэтага палёту не аставалася ніякіх сумненняў у тым, што полюс можна пакарыць толькі пры дапамозе самалёта. Высокашыротная экспедыцыя была ўключана ў план работ «Главсевморпути».

Правадыр народаў, лепшы друг лётчыкаў І. В. Сталін ухваліў нашы пачынанні і прапанаваў старанна падрыхтаваць экспедыцыю. Не прайшло і года, як мы пайшлі на штурм полюса. Таварыш Сталін вельмі ўважліва сачыў за ходам падрыхтоўкі да высокашыротнай экспедыцыі. Ён асабіста разглядаў прапанаваны намі склад экспедыцыі і зацвердзіў яго.

Такая выключная ўвага таварыша Сталіна натхніла нас, запаліла жаданнем барацьбы і нарадзіла непахісную ўпэўненасць у перамозе.

І мы пераможам! На Паўночным полюсе будзе развявацца флаг нашай радзімы!

НА ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС

(Гутарка з начальнікам экспедыцыі акад. О. Ю. Шмідтам)

Удзельнікі вялікага арктычнага пералёту Масква — востраў Рудольфа на некалькі дзён затрымаліся ў гасцінай сталіцы запалярнай Ненецкай акругі—Нар'ян-Мары.

Незадоўга да вылету звяна ў далейшую дарогу начальнік экспедыцыі на полюс акадэмік Отто Юльевіч Шмідт у гутарцы з прадстаўнікамі друку расказаў аб задачах экспедыцыі і плане яе работ.

«Совецкі паход к паўночнаму полюсу,— заявіў ён, — завяршае вялікі этап шматгадовай работы па вывучэнню і асваенню Поўначы совецкімі палярнікамі, вучонымі, маракамі і лётчыкамі.

Мы прыдавалі вельмі невялікае значэнне ўстанаўленню палярных рэкордаў, а бачылі сэнс нашай дзейнасці у тым, каб прымусіць і крайнюю Поўнач служыць інтарэсам нашай краіны і ўсяго чалавецтва. Рэкорды атрымліваліся папутна, як пры ўсякай добрай рабоце.

Чаму мы імкнемся на Паўночны полюс?

Мы хочам на ім угрунтавацца, каб правесці рознастайныя навуковыя работы, якія маюць вялікае практычнае значэнне. Совецкая палярная станцыя ў раёне Паўночнага полюса будзе рэгулярна наглядаць надвор'е і паведамляць аб яго становішчы ў Цэнтральнае бюро надвор'я, дзе гэтыя весткі будуць мець велізарнае значэнне пры прадсказаннях надвор'я, у асаблівасці пры складанні доўгатэрміновых прагнозаў. Апрача таго, там будуць правезены работы па магнітных нагляданнях, па вывучэнню напрамку і хуткасці руху ільду, па вымярэнню глыбінь Ледавітага акіяна, па вызначэнню хімічных і фізічных уласцівасцей розных слаёў валы, на высвятленню таго, у якіх формах захоўваецца жыццё ў цэнтральнай частцы акіяна і т. д. Асаблівае-ж значэнне набывае палярная станцыя ў раёне полюса, як пункт радыёсувязі. Самалёты, якія ў далейшым будуць лятаць у гэтым раёне і, можа быць, нават рабіць рэгулярныя рэйсы праз полюс у Амерыку, змогуць арыентавацца радыёсігналамі станцыі, а таксама загадзя атрымліваць дакладныя весткі аб надвор'і.

Для выканання такой праграмы недастаткова пабыць на полюсе некалькі гадзін, як гэта ўдалося ў 1909 годзе амерыканцу Роберту Піры, а тым больш недастаткова праляцець над полюсам на самалёце ці дырыжаблі, як гэта зрабілі Берд, Амундсен і Нобіле.

Мы хочам уключыць раён Паўночнага полюса цвёрда ў наша звычайнае кола дзейнасці, угрунтаваўшыся там надоўга. Задача, несумненна, трудная. Але ў нашай краіне, і толькі ў нашай краіне, створаны ўсе ўмовы для выканання такіх смелых пачынанняў. Совецкі ўрад ужо шмат год моцна падтрымлівае і накіроўвае нашу арктычную работу. Мы накапілі велізарны вопыт на палярных зімоўках, у часе ледакольных паходаў і арктычных палётаў. У нас выраслі кадры выдатных работнікаў, якія ведаюць Поўнач і адданы радзіме, якіх не страшна пасылаць на такую справу.

У нашым прадпрыемстве, вядома, асабліва вялікая роля авіяцыі. Пасля подвігаў герояў Совецкага Саюза па выратаванню чалюскінцаў, пасля раду бліскучых арктычных рэйсаў Леванеўскага, Вадап'янава, Молакава, Алексеева і іншых, пасля выдатнага палёту тав. Чкалава і яго спадарожнікаў можна не сумняваццца, што палёты на полюс нашай авіяцыі ўжо на плячу.

Вызначыўшы становішча полюса і праляцеўшы над ім, мы пашукаем у раёне полюса найбольш зручную крыгу, годную для пасадкі цяжкіх самалётаў, нагружаных снарадзеннем для палярнай станцыі. Гэта трудная пасадка на непадрыхтаваную пляцоўку патрэбуе ўсяго ўмення і вопыту нашых палярных лётчыкаў. Разумеецца, станцыя не будзе пастаянна знаходзіцца на самым пункце полюса, яна будзе пастаўлена на ільду і разам з ім будзе дрэйфаваць, быць можа, у розных напрамках, а праўдападобней за ўсё—у бок Амерыкі. У гэтым ёсць тая вялікая выгада, што нагляданні станцыі ахопяць большы раён.

Несумненна, уся краіна будзе з выключнаю ўвагаю і любоўю сачыць за жыццём і работаю таварышоў Папаніна, Крэнкеля, Шыршова і Фёдарава—чатырох смелых сыноў нашага народу, якія будуць жыць на працягу года ў палатцы каля полюса.

Гутарачы з вамі ў Нар'ян-Мары, мы знаходзімся яшчэ ў пачатку нашага шляху. Мы можам ужо сцвярджальна сказаць, што самалёты «АНТ-6», спецыяльна зробленыя для нас, — выхатныя машыны. Мы таксама пераканаліся ў высокіх якасцях нашага калектыва пілотаў, штурманаў, механікаў, радзістаў, сіноптыкаў і інш.

Калектыў у нас дружны. Кожны з яго складу мае за сабою ўжо вялікі стаж палярнай работы.

Такім чынам, матэрыяльная частка ў нас бліскучая, людзі добрыя, а за намі вялікая краіна, кіруемая мудрай партыяй Леніна—Сталіна. Вось чаму мы адпраўляемся ў дарогу цвёрда ўпэўненыя ў перамозе».

УДЗЕЛЬНІКІ ЗІМОЎКІ АБ СВАЁЙ РАБОЦЕ

І. Д. Папанін—начальнік зімоўкі

ЛАГЕР НА ПОЛЮСЕ

Ідэя завалявання Паўночнага полюса ў мяне зарадзілася даўно, некалькі год таму назад. Будучы яшчэ кіраўніком палярных зімовак на мысе Чэлюскіна і на Зямлі Франца-Іосіфа, я марыў дрэйфаваць у раёне Паўночнага полюса.

Вярнуўшыся з зімоўкі, я даведаўся, што рад палярнікаў прапанавалі ўжо сфарміраваць экспедыцыю на паўночны полюс. Зімоўшчыкаў з усім снарадзеннем меркавалася перакінуць на полюс з самалётамі і высадзіць на дрэйфуючую крыгу. Атрымаўшы згоду на арганізацыю і падрыхтоўку экспедыцыі, я горача ўзяўся за справу.

«Главсевморпуть» выдзеліў для арганізацыі экспедыцыі неабходныя сродкі. Падрыхтоўка пачалася яшчэ ў лютым 1936 года.

У першую чаргу я стаў рыхтаваць адзенне, палатку, харчаванне. Неабходна было старанна падрыхтавацца да зімоўкі і, разам з тым, стварыць надзейную базу на самым паўночным пункце совецкай зямлі — востраве Рудольфа.

У 1936 годзе ледакол «Русанов» даставіў на востраў Рудольфа найбольш цяжкія грузы, харчаванне, гаручае і частку навуковага снаражання.

Не малых клопатаў каштаваў падбор удзельнікаў зімоўкі. У Ленінградзе я сустрэўся з Петром Петровічам Шыршовым. Тав. Шыршоў даў згоду прыняць удзел у экспедыцыі ў якасці гідролага і гідрабіёлага. Пётр Петровіч паспеў ужо набыць дастатковы вопыт, як удзельнік экспедыцый «Сибирякова» і «Челюскина».

Я рашыў таксама ўзяць у экспедыцыю тав. Фёдарава, які быў маім памочнікам па навуковай рабоце на зімоўках мыса Чэлюскіна і Зямлі Франца-Іосіфа. Тав. Фёдараў — вельмі здольны магнітолаг і астраном. Ён ахвотна прыняў маю прапанову. Чацвертым удзельнікам зімоўкі быў намечан тав. Крэнкель.

Падрыхтоўчыя работы разгарнуліся ў сакавіку мінулага года. Была заказана асобая — лёгкая, партатыўная і моцная апаратура для навуковых наглядання. Агульная вага снаражэння, абсталявання, розных грузаў разам з людзьмі не павінна была перавышаць 9 тон. Запас харчавання, адзення, гаручага разлічан на паўтара года.

У вопытнай ленінградскай радыёлабараторыі тэрмінова была заказана радыёстанцыя для тав. Крэнкеля.

У загатоўцы неабходнага харчавання вялікую дапамогу аказаў Інстытут інжынераў харчавання. Кожны прадукт, прадназначаемы для экспедыцыі, падвяргаўся старанному аналізу. Мы бярэм прадукты, якіх звычайна ў асартыменце палярных станцый няма. Згатаваны лёгкія, сухія канцэнтраты капусты, гарохавага супа, кісляў, кампота, мясных катлет.

Нашы прадукты характарызуюцца вялікай каларыйнасцю. Яны зроблены настолькі рознастайна і смачна, што аб захворванні цынгой не можа быць і гутаркі.

Зімоўшчыкі атрымаюць найлепшае механавое адзенне. Ніжняя бялізна звязана з высокаякаснай шэрсці.

Мы раздзялілі паміж сабою работу так, каб кожны з нас мог замяніць адзін другога. Мяне, начальніка, у выпадку неабходнасці можа замяніць Крэнкель. Здарыцца што-небудзь з Крэнкелем —яго заменіць Фёдараў. Выйдзе са строю Фёдараў — астранамічныя і магніталагічныя работы буду весці я, Метэаралагамі мы будзем усе. Кожны з нас таксама ўмее гатаваць ежу.

Урачом на зімоўцы будзе тав. Шыршоў. На працягу 6 месяцаў ён праходзіў спецыяльную практыку пры ленінградскай гарадской больніцы.

Калі самалёт, на якім мы вылецім на полюс, не зможа апусціцца на крыгу, прыдзецца высаджвацца са снаражэннем і грузамі, карыстаючыся парашутамі. Які шлях мы праробім у дрэйфе—прадсказаць немагчыма.

На полюсе мы ўмацуем шаўковы чырвоны флаг з вобразам любімага правадыра народаў таварыша Сталіна і другі кумачовы флаг—з гербам нашай чароўнай радзімы. На паўночным полюсе будзе развявацца таксама блакітны вымпел Галоўнага кіраўніцтва чаўночнага морскога шляху.

АБ БУДАЎНІЦТВЕ ШКОЛЫ Ў ЖУРАВІЦКІМ РАЁНЕ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Лічыць недапушчальным, што Журавіцкі райвыканком пытаннем будаўніцтва школы не займаўся, у выніку да будаўніцтва школы не прыступлена, райвыканком фактычна самаўхіліўся ад гэтага важнейшага будаўніцтва, устаноўленага народнагаспадарчым планам на 1937 г. Выходзячы з гэтага, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць старшыні Журавіцкага райвыканкома т. Себясевічу незадкладна прыступіць да будаўніцтва школы з тым, каб школа была закончана і ўведзена ў эксплаатацыю ва ўстаноўлены СНК БССР тэрмін — 15 жніўня 1937 г.

2. Пытанне аб безадказных адносінах старшыні Журавіцкага райвыканкома т. Себясевіча разгледзець асобна 15 чэрвеня і вырашыць яго ў залежнасці ад ходу будаўніцтва школы.

Намеснік старшыні Совета Народных Камісараў БССР
А. ЛЮБОВІЧ.

В. а. кіраўніка спраў Совета Народных Камісараў БССР
Д. МІХАЙЛАЎ.

17 мая 1937 г.
г. Менск.

X З'ЕЗД КП(б) ГРУЗІІ

ТБІЛІСІ, 21 мая. (БЕЛТА). Закрыўся 10 з'езд КП(б) Грузіі. Тайным галасаваннем выбраны: Цэнтральны Камітэт компартыі Грузіі ў колькасці 75 членаў і 25 кандыдатаў і Рэвізійная камісія.

З'езд паслаў прывітанне вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну, аднагалосна выбранаму членам ЦК КП(б) Грузіі.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі з'езд намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

***

ТБІЛІСІ, 21 мая. (БЕЛТА). 21 мая адбыўся першы пленум новазбранага ЦК компартыі Грузіі. Пасля выбараў бюро пленум аднагалосна выбраў першым сакратаром ЦК тав. Лаўрэнція Берыя.

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

ЛЕПЕЛЬСКАЯ АКРУГА

ЛЕПЕЛЬ, 20 мая. Учора ў 14 гадзін дня адкрылася другая лепельская акруговая партканферэнцыя. На канферэнцыю з'явілася 205 дэлегатаў з рашаючым голасам і 34 з дарадчым. Адсутнічае 17 дэлегатаў па невядомых прычынах.

Пасля выбараў кіруючых органаў канферэнцыя заслухала справаздачу тав. Ляхава аб рабоце акруговага камітэта партыі. У сваім дакладзе тав. Ляхаў толькі ў агульных рысах спыняўся на кіраўніцтве і становішчы партыйнай работы ў акрузе. Гаворачы аб агітацыі, ён абмяжоўваўся толькі тым, што прыводзіў ацэнку становішча палітычнай агітацыі, якую даў ЦК КП(б)Б у сваім рашэнні па лепельскай справе два месяцы назад.

Справаздачу аб тым, як выпраўляюцца дапушчаныя грубейшыя палітычныя памылкі ў Лепелі, тав. Ляхаў звёў толькі да інфармацыі аб мерапрыемствах, якія праводзяцца ў сэнсе звароту матэрыяльных страт, панесеных калгаснікамі і аднаасобнікамі ў рэзультаце парушэння рэволюцыйнай законнасці.

Дакладчык не заастрыў увагі канферэнцыі на неабходнасці ўмацавання рэволюцыйнай пільнасці ў партарганізацыях граніцы. Аб момантах страты рэволюцыйнай пільнасці гаворыць такія факты: сярод выключаных з партыі пасля абмену партдакументаў з 35 чалавек нямала ворагаў народу; аб выкрытым зараз ворагу народу Пацэнгелі ў акругкоме партыі былі сігналы яшчэ ў лістапе 1936 года. Аднак, акругком, замест вырашэння пытання аб партыйнасці Пацэнгеля, вынес ліберальную пастанову, у якой толькі асудзіў контррэволюцыйнае выступленне апошняга.

Ні адно пытанне аб партыйнай рабоце не было поўнасцю ахарактарызавана ў дакладзе.

***

21 мая на акруговай партканферэнцыі пачаліся спрэчкі. Дэлегаты падвергілі жорсткай крытыцы работу акругкома партыі і даклад тав. Ляхава.

Дэлегаты т. Элентух, Ігнацьеў і рад іншых гаварылі аб адрыве бюро акругкома партыі не толькі ад шырокіх беспартыйных мас, але і ад партыйных арганізацый акругі. У выніку рад створаных акруговых арганізацый і ў першую чаргу акругком партыі не справіўся з задачамі, пастаўленымі перад імі ў часе стварэння пагранічных акруг.

Таварышы гаварылі, што Ляхаў і Пушчын лічаць сябе правадырамі, захапіліся некаторымі поспехамі і не бачылі, як груба парушалася рэволюцыйная законнасць.

Выступаўшыя дэлегаты многа гаварылі аб недахопах у пастаноўцы абаронпай работы. Гэтаму важнейшаму пытанню ва ўмовах граніцы не адвялі належнай увагі. Акрвыканком ужо другі год збіраецца абмеркаваць на прэзідыуме пытанне становішча абаронпай работы.

З выступлення Жалезніцкага, Кірпічэнка і інш. дэлегатаў канферэнцыі становішча зразумелым, чаму тав. Ляхаў у сваім дакладзе нічога не сказаў аб рабоце бюро і апарата акругкома, не ахарактарызаваў становішча ўнутрыпартыйнай работы. Тав. Кірпічэнка (Чашніцкі раён) гаворыць:

— Калі акругком партыі збірае партыйных работнікаў, ён не вучыць як арганізоўваць работу, а ў большасці падносіць якую-небудзь страшню.

Выступаючыя адзначалі, што нізавыя партарганізацыі не адчувалі акругкома партыі. Сакратар Чашніцкага райкома партыі т. Марголін заявіў:

— Ніякага кіраўніцтва і дапамогі ад акругкома я не атрымліваў. Сакратароў райкома не выклікалі, не гаварылі з імі па сур'ёзных пытаннях партыйнага жыцця. Тав. Марголін, як член пленума акругкома, расказвае канферэнцыі, што за ўвесь час ён быў толькі на адным пленуме, дзе абмяркоўваліся вынікі абмену партдакументаў. Да гэтага часу ён, як член пленума, не ведаў аб справах ворага народу Пацэнгеля. Ён указвае, што ў рабоце бюро існавала сістэма засакрэчвання важнейшых спраў, нерашучасць у вырашэнні пытанняў у адносінах да ворагаў народу. На выкрытых фактах не мабілізоўвалася партарганізацыя, кіруючы партыйны актыў акругі і раёнаў.

Аднак усё-ж размовы многіх дэлегатаў аб пільнасці абмяжоўваліся толькі канстатацыяй даўно вядомых усёй арганізацыі фактаў дзеяння класавых ворагаў. Далей гэтага не ішоў у сваім дакладзе і т. Ляхаў. Гэта безумоўна акрэсліла і выступленні раду дэлегатаў канферэнцыі, у той час, калі яшчэ і сёння ёсць не мала фактаў дзеяння ворагаў, калі існуе палітычная бестурботнасць у бюро акругкома партыі.

Сёння працяг спрэчак па справаздачнаму дакладу акругкома.

Ц. ФРЫД.

СЛУЦКАЯ АКРУГА

Па-ранейшаму ў рабоце другой слуцкай акруговай партканферэнцыі вялікае месца займаюць пытанні партыйнай работы ў масах. Практыка яшчэ і яшчэ раз паказвае, што слабасць сувязі партыйнай арганізацыі з масамі, нізкі ўзровень узброенасці комуністаў і беспартыйных мас рэволюцыйнай пільнасцю скарыстоўваюцца махровымі ворагамі народу ў сваіх контррэволюцыйных, шкодніцкіх мэтах. Аб подлых, каварных метадах рэпткаў нераззброеных ворагаў—трацкістаў, нацдэмаў, эсэраў і інш. гаворыць дэлегат канферэнцыі начальнік акруговага аддзела НКУС т. Озераў. Шкоднікі, шпіёны і дыверсанты разумеюць значэнне пагранічнасці Случчыны і таму імкнуцца ў першую чаргу іменна тут абаснавацца і шкодзіць. Немалую антысавецкую работу праводзяць царкоўнікі. Акруговы камітэт партыі недаацаніў антырэлігійную работу. Гэтым карыстаюцца ворагі.

Многа ўвагі дэлегаты аддаюць пытанням авалодання большэвізмам, вывучэння гісторыі большэвіцкай партыі. Як-жа акруговы камітэт арганізаваў вывучэнне гісторыі партыі? Нездавальняюча. У лепшым выпадку, культпроп акругкома клапаціўся аб колькасным ахопе комуністаў. Ідэйным зместам, якасцю партыйнай прапаганды і агітацыі, падборам прапагандысаў акругком глыбока не займаўся. Аб гэтым гаварылі ў сваіх выступленнях дэлегаты тт. Жалезнікаў, Чарноў, Глыкін, Сабадаж, Фалгзак і іншыя.

Многія таварышы (тт. Ціхаміраў, Чыкалаў, Жукаў, Німанаў, Зінковіч, Амосаў і інш.), асабліва дэлегаты вайсковых і пагранічных часцей, гавораць аб буйнейшых недахопах і недастатковасці кіраўніцтва акругкома пытаннямі абаронпай работы сярод працоўнага насельніцтва.

Тав. Бурдзілаў — сакратар Чырвонаслабодскага райкома КП(б)Б — крытыкуе акругком за тое, што ён вельмі туга перабудоўвае сваю работу.

— Мы, райкомаўцы і акругком — гаворыць тав. Бурдзіраў — не можам пахваліцца большэвіцкім стылем работы. Акругком і райком патрабавалі ад комуністаў толькі выканання гаспадарчых кампаній. Але не дапамаглі, не навучылі радавых комуністаў стаць сапраўднымі важакамі мас. Сістэма работы акругкома была парочнаю. Замест глыбокага вывучэння і дапамогі пярвічным партыйным арганізацыям займаліся гастралёрствам. Акругком слаба прыслухоўваўся да голасу мас. Ён меў многа сігналаў аб грубейшых парушэннях рэволюцыйнай законнасці. Ён ведаў, што ў многіх месцах з рахункаў скінулі аднаасобнікаў, папіраюць іх правы. Але акругком своечасова не рабіў адпаведных палітычных вываадаў.

— Акругком, партарганізацыя не сталі на чале перабудовы работы советаў. Раней советы многа камандавалі. Лепельскія справы многаму навучылі. Але характэрна, што некаторыя советы, замест перабудовы, разгубіліся. Адзін старшыня сельсовета нашага раёна заявіў: «Раней я ведаў, як гаварыць з аднаасобнікамі, і яны мяне слухалі, а цяпер не слухаюць». Гэты чалавек яшчэ і цяпер не разумее, што партыя не дазволіць камандаваць, а патрабуе цярплівай масавай работы.

— Ёсць у нас і такія факты, калі некаторыя старшыні советаў кідаюцца ў адваротную крайнасць, — не прымаюць мер да аднаасобнікаў, якія захватваюць зямлю калгаса, хоць гэта яўна варожая работа. Акруговы выканаўчы камітэт не кіруе перабудовай работы советаў, сур'ёзна не рыхтуецца да надыходзячых выбараў па новай Канстытуцыі.

Наогул-жа аб кіраўніцтве партыйнай арганізацыі акругі перабудовай работы советаў, у адпаведнасці з рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), на партканферэнцыі гавораць вельмі мала. А між тым, акруговы выканаўчы камітэт і яго аддзелы перабудоўваюць сваю работу больш чым марудна. А асобныя кіруючыя таварышы проста не зразумелі сутнасці перабудовы работы советаў.

Тав. Беразоўскі гаворыць аб дрэнным кіраўніцтве Наркомасветы, аб ворагах народу, якія там арудвалі. Але літаральна ніводным словам ён не абмовіўся аб рабоце акруговага аддзела нарасветы, аб кіраўніцтве ідэалагічным фронтам акругкомам КП(б)Б. А гаварыць было пра што. Прарываў у сістэме народнай асветы, сігналаў аб контррэволюцыйнай дзейнасці ворагаў у паасобных школах больш чым дастаткова.

Літаральна ў такім-жа стылі выступіў і тав. Каралёў. Ні цэню крытыкі і самакрытыкі, ні слова аб партыйным кіраўніцтве. Не дзіўна, што гэтыя выступленні рэзка крытыкавалі рад дэлегатаў канферэнцыі.

У выступленнях дэлегатаў чамусьці поўнасцю выпалі пытанні кіраўніцтва партыйнай арганізацыяй стахановскім рухам у сельскай гаспадарцы. Прымудрыўся абыйсці гэта пытанне ў сваім выступленні і загадчык сельгасаддзелам акругкома тав. Бабак.

Да канца ранішняга пасяджэння 21 мая выступіла 38 дэлегатаў. Актыўнасць дэлегатаў не змяншаецца. У прэзідыум прадаўжаюць паступаць заяўкі жадаючых выступіць. Усё-ж асобныя дэлегаты праяўляюць несур'ёзныя адносіны да сваіх абавязкаў, без дазволу пакідаюць пасяджэнне канферэнцыі. У парадку чаргі слова было прадастаўлена дэлегатам Лемішову і Кардашу, але ні аднаго з іх у зале не аказалася.

На вячэрнім пасяджэнні 21 мая прадаўжаліся спрэчкі па справаздачнаму дакладу акругкома.

І. ШЛЯФЕР.

БАРЫСАЎСКІ РАЁН

21 МАЯ. Позна ноччу 20 мая шчотная камісія паведаміла вынікі тайнага галасавання кандыдатур у члены раённага камітэта. Выбран 31 чалавек, сярод іх таварышы Манаеў (сакратар РК ранейшага складу) і інш. З членаў пленума ранейшага складу выбрана дзесяць чалавек.

У часе работы шчотнай камісіі канферэнцыя прыступіла да вызначэння і абмеркавання кандыдатур дэлегатаў на з'езд КП(б)Б з правам рашаючага голасу. Па модусу належыць выбраць 32 дэлегаты. Высунута 80 кандыдатур. Калі ўжо было абмяркована 20 кандыдатур (з якіх уключана ў спіс 17), канферэнцыя, адзначыўшы, што да гэтага пытання няма дастаткова сур'ёзных адносін з боку асобных дэлегатаў, рашыла пачаць абмеркаванне панава. Як паказвае далейшы ход работы канферэнцыі, такое рашэнне было зусім мэтазгодным. Абмеркаванне праходзіць цяпер больш дзелавіта, чым раней.

21 мая канферэнцыя выбірала кандыдатаў у члены пленума райкома. Было высунута 23 кандыдатуры. Пасля абмеркавання ўключана ў спіс 8 чалавек. У выніку тайнага галасавання выбрана 7 чалавек.

21 мая, таксама тайным галасаваннем, выбрана рэвізійная камісія.

У часе работы шчотнай камісіі канферэнцыя абмяркоўвае кандыдатуры дэлегатаў на з'езд КП(б)Б.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.

ГОМЕЛЬ

На працягу 4 дзён партканферэнцыя працавала над выбарамі кіруючых органаў гарадской партарганізацыі і дэлегатаў на з'езд КП(б)Б. У склад гаркома КП(б)Б было названа 88 кандыдатур. Пасля ўсебаковага і сур'ёзнага абмеркавання 28 чалавек былі адведзены і ў спіс для тайнага галасавання ў члены гаркома КП(б)Б было ўключана 60 чалавек.

Тайнае галасаванне праходзіла арганізавана. Членамі гаркома КП(б)Б абрана 39 чалавек.

Потым канферэнцыя прыступіла да выбараў кандыдатаў у склад гаркома, рэвізійнай камісіі і дэлегатаў на XVI з'езд КП(б)Б. Усе гэтыя тры працэсы канферэнцыя зрабіла адначасова: адначасова абмеркавалі кандыдатуры для ўключэння ў спіс для тайнага галасавання ў кандыдаты гаркома КП(б)Б, у склад рэвізійнай камісіі і на з'езд КП(б)Б, адначасова было праведзена і тайнае галасаванне па трох спісах. Гэта дало канферэнцыі магчымасць на многа скараціць час сваёй работы.

У склад рэвізійнай камісіі абрана 7 чалавек. На XVI з'езд КП(б)Б абрана 60 чалавек з правам рашаючага голасу і 10 чалавек з правам дарадчага голасу.

На ранішнім пасяджэнні 20 мая канферэнцыя заслухала і зацвердзіла рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу гаркома партыі. Канферэнцыя ў сваёй пастанове дала жорсткую крытыку недахопаў гаркома КП(б)Б. Канферэнцыя абавязала новы склад гаркома неадкладна выправіць усе недахопы і разгарнуць перабудову партыйнай работы на аснове рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

ЧЫКУН.

ВІЦЕБСК

21 мая працягвалася абмеркаванне кандыдатур дэлегатаў на з'езд КП(б)Б. У рэзультаце тайнага галасавання выбранымі на з'езд аказаліся: з рашаючым голасам 61 чал. і з дарадчым 11. Сярод іх тт.: Шусцін, Жураўлёў, Галадзёд, Юркоў, Дзеніскевіч, Башмачнікаў, Сухаручкін, Эстрын і інш. Сярод дэлегатаў — значная колькасць стахановцаў, старых кадравых рабочых і работніц — Гофман (шчацінны камбінат), Раманава і Міхайлава (фабрыка імя Кагановіча), Білевіч («Сцяг індустрыялізацыі), Багамолава (акулярная фабрыка) і інш.

Выбраннем дэлегатаў на з'езд КП(б)Б віцебская партыйная канферэнцыя закончыла сваю работу. Уся работа канферэнцыі, якая прадаўжалася 9 дзён, праходзіла пры вялікай актыўнасці пад знакам большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, баявой згуртаванасці вакол партыі Леніна—Сталіна і свайго любімага правадыра таварыша Сталіна.

Дэлегаты канферэнцыі ў сваіх выступленнях унеслі шмат каштоўных прапаноў па перабудове і паляпшэнню ўсёй партыйна-масавай і палітычнай работы на аснове рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б), даклада і заключнага слова таварыша Сталіна.

***

Пасля закрыцця партыйнай канферэнцыі адбыўся арганізацыйны пленум уноў выбранага гаркома партыі. У рэзультаце тайнага галасавання пленум гаркома аднагалосна выбраў першым сакратаром гаркома тав. Жураўлёва і другім тав. Дзеніскевіча. У склад бюро выбрана 7 членаў і 2 кандыдаты.

Склад пленума гаркома партыі значна абнавіўся. З 40 членаў пленума — 27 новых таварышоў, якія раней не састаялі членамі гаркома. Сярод іх рад стахановцаў прадпрыемстваў, як тт. Білевіч, (фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі»), Багамолава (акулярная фабрыка), Бачмаеў (чыгунка) і інш.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

МАГІЛЕЎСКІ РАЁН

Сакратар оргбюро сельрайкома тав. Кузьмін няўдала пабудаваў даклад аб рабоце райкома. Больш 30 мінут патраціў ён на агульныя пытанні. Гаварыў аб недахопах работы райвыканкома і яго аддзелаў, але нічога амаль не сказаў аб галоўным — аб партыйна-палітычнай рабоце. Ён абыйшоў і вынікі справаздачна-выбарных сходаў, а таксама не сказаў дэлегатам канферэнцыі, як выконваюцца рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

Даклад тав. Кузьміна быў несамакрытычным. Дакладчык не ўскрыў недахопы работы райкома, не мабілізаваў партарганізацыю на большэвіцкае выкананне чарговых задач, выцякаючых з рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і даклада таварыша Сталіна.

Сёння адбываюцца спрэчкі па дакладу райкома.

БРЫЛОН.

БАБРУЙСКІ РАЁН

Актыўна і дзелавіта з большэвіцкай прынцыповасцю дэлегаты абмяркоўвалі кожную кандыдатуру ў спіс для тайнага галасавання ў склад членаў райкома.

На ранішнім пасяджэнні 20 мая абвяшчаецца, што ў рэзультаце абмеркавання ў члены райкома пакінута ў спісу 41 кандыдатура, адведзена 23, пасля чаго была абрана шчотная камісія ў складзе 9 чалавек. Калі шчотная камісія пайшла ў сумежны пакой для падліку рэзультатаў тайнага галасавання, канферэнцыя прадаўжала сваю работу.

Пасля перапынку абгалошваюцца рэзультаты тайнага галасавання. Большасцю галасоў у склад членаў райкома партыі абрана 30 чалавек. Дзве кандыдатуры, атрымаўшыя роўную колькасць галасоў, перагаласоўваліся на ранішнім пасяджэнні 21 мая. Такім чынам у райком абралі 31 чалавека.

Па прапанове члена бюро ЦК КП(б)Б тав. Чарвякова канферэнцыя рашыла абраць замест 5 чалавек кандыдатаў у члены райкома — 7 чалавек, каб папоўніць прабел і абраць у кандыдаты членаў райкома комуністаў, працуючых на вытворчасці, якіх, на жаль, у райком абрана вельмі мала — усяго толькі 1 чалавек.

Дзённае пасяджэнне 21 мая закончылася тайным галасаваннем кандыдатур у склад кандыдатаў у члены райкома.

Вялікім недахопам канферэнцыі з'яўляецца тое, што пры галасаванні ў члены райкома не ўдзельнічала 34 дэлегаты, якія адсутнічалі на канферэнцыі. Пры перагаласоўванні двух кандыдатур адсутнічала 65 дэлегатаў.

ВЯРХОЎСКІ.

У ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК КП(б)Б і СНК БССР разгледзелі рад пытанняў, звязаных з далейшым ростам і творчай работай тэатра оперы і балета і Беларускага драматычнага тэатра.

У бліжэйшы час для пастаяннай работы ў тэатр оперы і балета запрашаюцца буйныя спецыялісты на пасады: галоўнага рэжысера, галоўнага дырыжэра, галоўнага мастака і галоўнага балетмейстэра.

Перад запрашаемымі спецыялістамі ставіцца задача: узняць оперны тэатр на высокую ступень яго мастацкага развіцця, а таксама вырошчвання мясцовых кадраў.

Дырэкцыі тэатра апрача гэтага прапанавана ўкамплектаваць склад салістаў оперыага тэатра, маючы на ўвазе запрашэнне ў тэатр 5—10 высокакваліфікаваных салістаў.

Камітэту па справах мастацтваў пры СНК БССР і дырэкцыі тэатра прапанавана на працягу 2—3 месяцаў укамплектаваць хор, аркестр і балет тэатра, шляхам запрашэння найбольш здольных і таленавітых людзей з самадзейных гурткоў фабрык, заводаў, калгасаў, навучальных устаноў.

Камітэту па справах мастацтваў прапанавана прадставіць свае меркаванні, якія забяспечваюць скančэнне ў гэтым годзе будаўніцтва дома для работнікаў тэатра. Горсовету даручана на працягу месяца прадставіць работнікам тэатра не менш 5 кватэр. Побач з гэтым Дзяржплану прапанавана ўнесці прапановы аб арганізацыі інтэрната для работнікаў тэатра на 50—70 чалавек.

Раду вядучых работнікаў тэатра і абслугоўваючаму персаналу значна павышан размер зарплаты.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязалі камітэт па справах мастацтва і дырэктарам оперыага і драматычнага тэатраў прадставіць на зацвярджэнне прапановы аб парадку і праграме ўзмацнення творчага росту і кваліфікацыі актэрскага складу тэатраў, прадугледзеўшы запрашэнне для гэтай мэты лепшых спецыялістаў-педагогаў, з буйнейшых цэнтраў СССР для прачытання лекцый, вядзення заняткаў і кансультацый.

Разам з тым дырэкцыям тэатраў прапанавана ўстанавіць практыку запрашэння выдатных пастаноўшчыкаў і рэжысераў з іншых тэатраў СССР для пастаноўкі асобных спектакляў.

У распараджэнне тэатра оперы і балета вылучаецца аўтамашына.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР вынеслі рашэнне аб рэпертуары 1-га Беларускага драматычнага тэатра. Камітэту па справах мастацтва і дырэкцыі тэатра даручана прыступіць да распрацоўкі арыгінальных беларускіх п'ес з тым, каб побач з перакладнымі лепшымі п'есамі, тэатр меў-бы і арыгінальныя п'есы на матэрыяле рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа і працоўнага сялянства Беларусі, а таксама п'есы, якія адлюстроўваюць поспехі сацыялістычнага будаўніцтва СССР і БССР. Саюзу пісьменнікаў прапанавана абмеркаваць гэта пытанне і прыняць практычныя мерапрыемствы да стварэння такіх п'ес.

Штат творчых работнікаў тэатра рашана павялічыць да 65 чалавек.

Дырэкцыі тэатра прапанавана стварыць неабходныя ўмовы для нармальнага росту маладых рэжысерскіх кадраў.

Раду вядучых творчых работнікаў і работнікам сцэны павялічан размер зарплаты.

Камітэту па справах мастацтва і Дзяржплану даручана прадставіць прапановы аб пабудове ў гэтым годзе дома для кватэр работнікам тэатра.

Камітэту па справах мастацтва прапанавана скласці праект рэканструкцыі будынка тэатра, а таксама пабудовы памяшкання для дэкаратыўных майстэрняў з пабудовай іх у гэтым годзе.

Для ўзмацнення складу вядучых творчых работнікаў і выхавання мясцовых кадраў тэатру дазволена прыцягненне 2—3 высокакваліфікаваных артыстаў з іншых тэатраў СССР.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапанаваў камітэту па справах мастацтва і дырэктарам оперыага і драматычнага тэатраў прадставіць на зацвярджэнне прапановы аб парадку і праграме ўзмацнення творчага росту і кваліфікацыі актэрскага складу тэатраў, прадугледзеўшы запрашэнне для гэтай мэты лепшых спецыялістаў-педагогаў, з буйнейшых цэнтраў СССР для прачытання лекцый, вядзення заняткаў і кансультацый.

Разам з тым дырэкцыям тэатраў прапанавана ўстанавіць практыку запрашэння выдатных пастаноўшчыкаў і рэжысераў з іншых тэатраў СССР для пастаноўкі асобных спектакляў.

У распараджэнне тэатра оперы і балета вылучаецца аўтамашына.

НА НАРАДЗЕ АКТЫВА РАБОТНІКАЎ РАДЫЁВЯЗШЧАННЯ

Сігналы, якія з'яўляліся на старонках нашага друку, гаварылі аб тым, што Радыёкамітэт не перабудаваў сваёй работы, што бясконцая блытаніна і нячоткасць у сістэме кіраўніцтва радыёвяшчання дае часам і цяпер магчымасць ворагу скарыстоўваць радыё для сваіх мэт.

Але спрэчкі па дакладу т. Гарачова на ўчарашнім дзённым пасяджэнні нарады насілі характар або вузка дзяляцкіх выступленняў (тт. Станкевіч, Плаўнік), або выступленняў з яўным намерам перакласці адказнасць за дрэнную работу радыёвяшчання на нізавых работнікаў, выгарадзіць усякім чынам кіраўніцтва Радыёкамітэта (выступленні тт. Гусева, Іёфе). Спроба закрануць найбольш хваравітыя пытанні кіраўніцтва Радыёкамітэта (выступленне т. Лебентава з Віцебска) сустрэла рэзкі адпор з боку асобных работнікаў камітэта.

Агульнае адзіўленне выклікала выступленне т. Гусева — галоўнага рэдактара літаратурнага вяшчання. Гусеў абмежаваўся гаварыльняй аб канцылярскіх, габінетных непаладках у камітэце і камплімэнтамі па адрасу новага кіраўніцтва камітэта.

Трэба не голае прызнанне існуючых недахопаў і зрываў, не фіксацыя і не дзяляпкі падыход да іх, а глыбокая, палітычна асэнсаваная крытыка, якая дапаможа Беларадыёкамітэту перабудаваць работу так, як гэта патрабуюць рашэнні Пленума ЦК ВКП(б).

Т. ХАДКЕВІЧ.

НОВЫ СКЛАД ПРАЎЛЕННЯ ЛІТФОНДА

19—20 мая праходзіў справаздачна-выбарчы сход членаў беларускага аддзялення літфонда СССР. Літфонд — арганізацыя, якая павінна была ўсімі сродкамі дапамагаць творчай рабоце совецкіх пісьменнікаў. Не гэтым, аднак, займалася беларускае аддзяленне літфонда. Былы старшыня яго Лейзераў бескантрольна і па-шкодніцку разбазарваў сродкі на іншыя мэты. Яго паслугамі шырока карысталіся ворагі народу. Палітычная блізарукасць некаторых пісьменнікаў-комуністаў і праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў, якому падпарадкавана беларускае аддзяленне літфонда, не садзейнічала ўскрыццю ўсіх агідпасцей, якія мелі месца ў літфондзе.

Толькі зараз у сувязі з кіршонаўскімі справамі ў Маскве, члены літфонда — совецкія пісьменнікі БССР на апошнім сходзе ўскрылі (праўда, яшчэ не ўсе) агідныя справы. Работа праўлення літфонда прызнана дрэннай. Закрытым (тайным) галасаваннем абраны новы склад праўлення літфонда. У яго ўвайшлі тт. К. Крапіва (старшыня) А. Александровіч, П. Галавач, М. Лынькоў і М. Кульбак.

РАШУЧА ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ АСОАВІЯХІМА

Шматмільённы Асоавіяхім — адно з самых папулярных, добраахвотных таварыстваў нашай краіны. Грамадзяне Совецкага Саюза бачаць у Асоавіяхіме тую арганізацыю, якая заклікана мацаваць абароназдольнасць радзімы, дапамагаць шырокім народным масам рыхтаваць кадры і рэзервы ўзброеных абаронцаў краіны сацыялізма. Не ва ўсім, аднак, Асоавіяхім апраўдвае гэтыя патрабаванні працоўных, і не заўсёды ён стаіць на ўзроўні сваіх вялікіх і адказнейшых задач. Указанні Цэнтральнага Камітэта партыі аб перабудове работы Асоавіяхіма рэалізуюцца вельмі марудна.

Адной з задач Асоавіяхіма з'яўляецца падрыхтоўка маладых грамадзян нашай краіны да ўступлення ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Асоавіяхім мае для гэтага тысячы вучэбных пунктаў і сотні лагераў. Ён мае кадры для гэтай падрыхтоўкі. У яго ўжо накоплен вопыт гэтай работы. І ўсё-ж да апошняга часу Асоавіяхім не здолеў забяспечыць высокую якасць ваеннай вучобы дапрызыўнікаў. Камандзіры воінскіх часцей, куды з'явіліся маладыя людзі, прайшоўшыя на Урале абучэнне на пунктах Асоавіяхіма, дрэнна адзываюцца аб баявой і палітычнай падрыхтоўцы гэтага папаўнення. Нездавальняюча вучылася моладзь ва Ўсходняй Сібіры і Азова-Чорнаморскім краі. Калі выключыць горад Маскву, то нават і Маскоўская вобласць недастаткова здавальняюча рыхтуе дапрызыўнікаў. У гэтым сказаліся арганізацыйныя немачы Асоавіяхіма, у першую чаргу няўменне выкарыстаць свае сілы, сродкі і вопыт.

Стралковая падрыхтоўка заўсёды з'яўлялася важнейшай часткай работы Асоавіяхіма. За тры гады ў нашай краіне падрыхтавана 1.700 тысяч варашылаўскіх стралкоў. У мінулым годзе 80 тысяч чалавек атрымалі значкі варашылаўскага стралка 2-й ступені. Пры ўсім гэтым Асоавіяхім не ўнікнуў сур'ёзных упушчэнняў. У некаторых выпадках значкі атрымалі людзі, недастаткова падрыхтаваныя ў стралковых адносінах. Пасля таго, як член таварыства атрымліваў значок варашылаўскага стралка, арганізацыі скрозь і ўсюды забывалі пра яго, не клапаціліся аб яго далейшай ваеннай падрыхтоўцы. Гэта сумнае становішча асабліва наглядна выявілася на праведзеных нядаўна праверачных стрэльбах, калі ў некаторых раёнах толькі 2—3 проц. усёй масы варашылаўскіх стралкоў змаглі паўтарыць патрабуемы залік.

Абучаючы стральбе з вінтоўкі, Асоавіяхім недаравальна забываў аб падрыхтоўцы байцоў другой агнястрэльнай зброі, у першую чаргу кулямётчыкаў. Хто-ж цяпер не ведае, як шырока будзе выкарыстан у сучасным баі кулямёт, які з'яўляецца не толькі зброяй пяхоты і кавалерыі, але і авіяцыі і мотамехвойск! Пачын Масквы ў падрыхтоўцы кулямётчыкаў заслугоўвае таго, каб яго падхапілі і іншыя гарады і вобласці.

Шэсць з лішнім мільёнаў грамадзян нашай краіны здалі нормы гатоўнасці да процівапаветранай і хімічнай абароны (ПВХА). Тым не менш работу Асоавіяхіма і ў гэтай галіне здавальняючай прызнаць нельга. Шмат тут яшчэ паказнога, дрэнна з кадрамі. Побач з выдатнай падрыхтоўкай некаторых прадпрыемстваў да процівапаветранай абароны існуюць і такія, дзе гэта справа пастаўлена з рук вон дрэнна. Вопыт вайны ў Іспаніі паказвае, наколькі важна вучыць загадзя шырокія масы насельніцтва абараняцца ад паветранага ворага. Трэба няўстанна клапаціцца аб павышэнні кваліфікацыі тых, хто ўжо здаў нормы ПВХА, каб не паўтарацца сумнай гісторыі з варашылаўскімі стралкамі.

Вялікую зацікаўленасць праяўляе наша моладзь да ваенна-морскай справы. Гэтая зацікаўленасць натуральная. Наша краіна вялікая марская дзяржава. Ёсць поўная магчымасць шырока разгарнуць і выдатна паставіць ваенна-морскую вучобу на нашых велізарных унутраных водных магістралях і тут рыхтаваць масы нашай моладзі да ганаровай вахты на морскіх рубяжах радзімы.

І, нарэшце, шырока вядом размах авіяработы ў нашай краіне. За 1936 год у аэраклубах Асоавіяхіма абучаны тысячы пілотаў і інструктароў. Аэраклубы таксама неабходны нашай моладзі, як бібліятэка, тэатр, кіно. Выявілася ўжо нямала перадавых арганізацый, але і ў гэтай вобласці работы Асоавіяхім не праяўляе сябе дастаткова актыўным арганізатарам. Авіяработа Асоавіяхіма праходзіць пад знакам крохаборства. Буйнейшымі недахопамі прасякнута работа ў галіне парашутызма і планерызма — гэтай масавай рэзервнай базы авіякадраў.

Такаво становішча ў некаторых найбольш важных абласцях дзейнасці таварыства. Ужо з гэтага відаць, як сур'ёзна і рашуча павінны паляпшаць сваю работу асоавіяхімаўскія арганізацыі і які размах яны павінны прыняць. Надышло лета — самая падыходзячая пара для разгортвання масавай абаронпай работы. Асоавіяхімаўскія арганізацыі ўжо зараз павінны праверыць гатоўнасць да летняй работы ўсіх сваіх кадраў і сваёй матэрыяльнай базы, якая, дарэчы сказаць, захоўваецца далёка не бліскуча.

Поспех работы арганізацый Асоавіяхіма залежыць ад падрыхтаванасці і праверанасці яго кіруючых кадраў. Пры той арганізацыйнай рыхласці, якая яшчэ назіраецца ў Асоавіяхіме, пры блізарукасці яго кіраўнікоў і няведанні ўласных работнікаў, на адказных пастах таварыства часта аказваюцца людзі, нездольныя весці адказную абаронную грамадскую работу. Больш таго, да кіраўніцтва ў Асоавіяхіме нярэдка прабіраюцца і ворагі народу, якія заўсёды імкнуліся пралезці ва ўсякую шчыліну на ўчастку абаронпай работы. Пільнасці, аснаванай на сазнанні сваёй высокай адказнасці перад краінай за ўмацаванне яе абароны, — вось чаго да гэтага часу нехапае арганізацыям Асоавіяхіма.

Гэта пачуццё адказнасці ў Асоавіяхіме не выхоўваецца. Дзейнасць многіх яго арганізацый апалітычна. Часта кіраўнікі партыйных і совецкіх органаў глядзяць на работу таварыства скрозь пальцы. Самае становішча Асоавіяхіма ў такіх абласцях, як Свердлоўская, Усходне-Сібірская, Оранбургская, Курская, служыць сведчаннем таго, што тут ніхто Асоавіяхімам не цікавіўся. Шматлікі выпадкі, калі на асоавіяхімаўскую работу пасылаюць людзей праштрафіўшыхся. Ці будзе ў гэтых умовах выхоўвацца ў асоавіяхімаўскіх работнікаў свядомасць высокай адказнасці за даручаную ім работу!

Асобна варта сказаць аб членах Асоавіяхіма — комуністах. Большэвік, дзе-б ён ні быў, у якой-бы арганізацыі ні лічыўся, ні працаваў, заўсёды адрозніваецца сваёй актыўнасцю, адданасцю справе, заўсёды выступае важаком масы, захапляе асабістым прыкладам, служыць узорам дысцыпліны і выхоўвае ў акружаючых усведамленне свайго доўгу і высокую пільнасць. Многія комуністы, якія з'яўляюцца членамі Асоавіяхіма, не праяўляюць гэтых большэвіцкіх якасцей у рабоце свайго таварыства. Нгак павялося, што многія комуністы толькі фармальна састаяць у Асоавіяхіме, толькі лічацца ў ім. Гэта — недастойна большэвікоў.

Асоавіяхім — добраахвотная грамадская арганізацыя. Яна павінна высока трымаць сцяг дэмакратызма. Між тым дэмакратычныя прынцыпы ў Асоавіяхіме груба папіраюцца. Працвітаюць назначэнства і каапцтацыя. Кіраўнікі перад масамі не адчытваюцца. Гэта парадзіла ў многіх кіраўнікоў зазнайства і бестурботнасць, звузіла крытыку і самакрытыку ў таварыстве, тармозіць актыўнасць яго членаў і замаражвае іх творчую самадзейнасць.

У чэрвені Асоавіяхім пачынае справаздачна-выбарчую кампанію. Калі Цэнтральны совет Асоавіяхіма рашуча не палепшыць свайго кіраўніцтва, у першую чаргу падрыхтоўкай кадраў, калі таварыства не ліквідуе сваёй арганізацыйнай распушчанасці, то і тыя 6 з паловай мільёнаў членаў, што асталіся ў Асоавіяхіме пасля перарэгістрацыі, працаваць як след не будуць.

Ачаг вайны на ўсходзе і захадзе не патухлі. Небяспека вайны ўзмацняецца з кожным днём. Больш таго, буржуазныя дзеячы ўсё часцей і часцей апраўдваюць сучасныя абставіны як правадзенныя. Тым лепш павінна праводзіцца работа па ўмацаванню абароны нашай краіны, тым больш увагі павінны зварачаць на яе партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі.

Асоавіяхіму многа дано — з яго і патрабаваць трэба куды больш, чым гэта было да гэтага часу. На жаль, абкомы і крайкомы партыі не аддаюць гэтай важнейшай грамадскай арганізацыі неабходнай увагі.

„Правда“.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

ЗАДАЧЫ ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У ТРЭЦЯМ ПЯЦІГОДЦЫ

Пастанова ЦВК і СНК Саюза аб вылучэнні водаахоўнай зоны высоўвае перад лясной гаспадаркай і лясной прамысловасцю рад важнейшых задач, якія павінны быць пакладзены ў аснову пры складанні плана трэцяй пяцігодкі.

У лясах БССР, якія вылучаны ў водаахоўную зону, устаноўленая рубка не перавышае гадавы прырост. У параўнанні з мінулымі гадамі яна скароціцца, прыкладна, на 25—30 проц. Перад кіраўніцтвам лесаховы і лесанасаджэнняў пастаўлена вялікая задача: спалучаць інтарэсы народнай гаспадаркі, максімальна забяспечваючы яе драўнінай, і адначасова берагчы лес, як водаахоўны фактар.

Аднак, такога спалучэння ў планах кіраўніцтва лесаховы пакуль што яшчэ няма. Складзены план рубак на пяцігодзе з'яўляецца яўна заніжаным. Тут прадугледжваецца вырубка ў размеры 3,2 мільёна кубаметраў па ўсіх відах карыстання, замест магчымай у 5—5,5 мільёна (улічваючы становішча лясоў БССР). Устаноўленая заніжаная рубка стварае ўмовы для накаплення перастойнай драўніны, што ў сваю чаргу прывядзе да паніжэння яе тэхнічных якасцей.

Складанне пяцігадовага плана па дрэваапрацоўчай прамысловасці цэсна ўвязана з планам рубак; таму неабходна ў самы карацейшы тэрмін вырашыць пытанне аб размеры рубак як у эксплаатацыйнай зоне, так і ў забароненай, дзе рубку лесу можна і неабходна весці, захоўваючы і паляпшаючы мерамі догляду, водаахоўныя і глебазабаронныя ўласцівасці лесу.

Размяшчэнне месц рубак павінна быць па магчымасці ўвязана з існуючымі механізаванымі пунктамі і палепшанымі шляхамі транспарту.

Сярэдні прырост ў лясах БССР у сучасны момант складае два кубаметры на адзін га, а па ўсіх лясах БССР гэта дае да 5 мільёнаў кубаметраў.

Улічваючы тую акалічнасць, што лясы БССР знаходзяцца ў спрыяючых натуральна-геаграфічных умовах вырастання (сярэдні бонітэт 2,6) і асноўваючыся на лесаводчых даных як іншых краін, так і ўласных навукова-даследчых работах, можна з упэўненасцю сказаць, што існуючы надзвычайна нізкі прырост у 2 кубаметры можа быць даведзен да 5 кубаметраў. Пры гэтых умовах прырост складзе каля 11 мільёнаў кубаметраў.

Запраектаванне на трэцюю пяцігодку цэлага раду лесагаспадарчых мерапрыемстваў дасць магчымасць паспяхова вырашыць задачу па ўзнаўленню прадукцыйнасці лясоў рэспублікі і тым самым павялічыць у будучым рубку амаль што ў 2—2,5 разы.

Праведзеныя ў мінулыя гады незначныя лесагаспадарчыя мерапрыемствы пры інтэнсіўнай эксплаатацыі (рубцы) стварылі вялікія пустыя плошчы, якія не засяваліся. Аблясенне іх, гэта значыць ператварэнне ў прадукцыруючыя, з'яўляецца адной з важнейшых задач лясной гаспадаркі. План трэцяй пяцігодкі павінен быць пабудован з такім разлікам, каб найбольш важная забаронная зона, якая аказвае непасрэдны ўплыў на водны рэжым рэк і як найбольш расстроеная рубкамі папярэдніх гадоў, была-б аблясена ў першую чаргу, ствараючы гідралагічна выгоднае размяшчэнне лясоў па тэрыторыі рэспублікі.

Не менш важная задача стаіць і перад лесазагатоўчымі арганізацыямі. Скарачэнне рубкі на бліжэйшы перыяд пры ўзрастаючай патрэбнасці ў драўніне абавязвае іх з усёй сур'ёзнасцю падысці да пытання аб рацыянальнай распрацоўцы драўніны. Максімальны выхад дзелавой драўніны пры распрацоўцы лесасек дасць дадатковую масу, годную для пераапрацоўкі на дрэваапрацоўчых прадпрыемствах. Калі выхад дзелавой драўніны пры загатоўках мінулых гадоў складаў, прыкладна, 50—55 проц., то пры абмежаваным размеры рубак гэты процант павінен быць у значнай ступені павялічан.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на распрацоўку ліцяных парод (дуб, альха, асіна і інш.), па якіх выхад дзелавой драўніны надзвычайна нізкі (у сярэднім 30 проц.). Такі нізкі процант выхаду дзелавой драўніны пры абмежаванай рубцы можа выклікаць напружанасць у забеспячэнні сыравінай фанернай і запалкавай прамысловасці.

Немалаважную ролю павінны адыграць і лясы мясцовага значэння, якія складаюць каля 18 проц. усёй лясной плошчы БССР. Выяўленыя на лесасечным фондзе запасы прамысловых асартыментаў (фанерная, запалкавая і іншая сыравіна) павінны поўнасцю перадавацца прамысловасці.

У мэтах найлепшага і больш рацыянальнага скарыстання прамысловасцю сыравіны да найбольш тэхнічна аснашчоных лесапільных заводаў неабходна прыдаць дрэваапрацоўчыя цэхі. Гэта вызваліць значную колькасць лесапільных рам, якія зараз заняты на развалцы бруса, для перакідкі іх ў іншыя раёны Саюза, забяспечыць апрацоўчыя цэхі неабходнымі піламатэрыяламі, абыгража некаторую частку драўніны для паглыблёнай пераапрацоўкі, якая зараз ідзе на абапалы і адкіды.

Неабрэзаны піламатэрыял, які паступіць у дрэваапрацоўчы цэх, дасць максімальны выхад асобных дэталей, бо плошча дошкі будзе выкарыстана найбольш поўна, абрэзка кромкі будзе бліжэй да збегу (што немагчыма на лесапільным заводзе).

Дрэваапрацоўчыя цэхі павінны быць арганізаваны з магчыма большым выпускам асобных відаў вырабаў. Іх патрэба падбіраць так, каб адыходы аднаго віду вырабаў маглі быць выкарыстаны як поўнакаштоўная сыравіна для іншых, прытым тэхналагічны працэс павінен быць пабудован з улікам максімальнага выкарыстання абсталявання.

Побач з дрэваапрацоўчымі цэхамі і прадпрыемствамі, якія вырабляюць гатовыя вырабы, неабходна арганізаваць прадпрыемствы, якія выпускалі-б асобныя дэталі з паслядоўнай зборкай іх на месцы збыту (склад, магазін, будоўлі і інш.). Як прыклад неабходнасці арганізацыі такіх прадпрыемстваў можна ўказаць на мэблевую фабрыку «Профінтэрн» (Мозыр), якая знаходзіцца ў 10 кілометрах ад чыгункі. Прадукцыя фабрыкі пры яе перавозцы (па дрэннай дарозе) і радзе перагрузак значна псуецца і патрабуе дадатковай яе аддзелкі (а іншы раз і замены дэталяў) на месцы, што стварае значныя цяжкасці з-за адсутнасці спецыяльных памяшканняў, кваліфікаваных рабочых і, зразумела, выклікае дадатковыя выдаткі.

Арганізацыя зборкі мэблі на месцы збыту вызваліць ад гэтых непрыемнасцей і ў дадатак дасць значную эканомію, разгрузіць ад перавозак чыгуначны транспарт.

У трэцяй сталінскай пяцігодцы не павінна быць такога становішча, калі амаль у кожнай арганізацыі (няхай яна будзе будаўнічая, гандлёвая, або прамысловая) існуюць цэхі або асобныя майстэрні па дрэваапрацоўцы, якія не могуць рацыянальна скарыстаць драўніну з-за абмежаванай вытворчасці або часовага свайго існавання.

Любая з указаных арганізацый павінна атрымліваць гатовую прадукцыю, або ў выглядзе асобных дэталей з наступнай зборкай іх у сябе ад спецыялізаванага дрэваапрацоўчага прадпрыемства.

Інжынеры: А. Ю. СТУЛЬФА, Н. Е. КУНЕВІЧ.

ПАБУДАВАЦЬ У БЕЛАРУСІ СУКОННЫ КАМБІНАТ

За гады першай і другой пяцігодак у БССР шырока развілася швейная прамысловасць.

Швейныя фабрыкі штодзённа ўжываюць вялікую колькасць суконнага і камвольнага тавараў. Да гэтага часу яны забяспечваюцца шарсцяным таварам з Сярэдняй Волгі, Маскоўскай вобласці, гор. Клінцоў і інш.

Мне здаецца, што з эканамічнага пункту гледжання наспела пытанне аб неабходнасці пабудовы суконнага камбіната ў адным з гарадоў Беларусі.

Эфэктыўнасць яго зразумела. Па-першае, фабрыкі-спажыўцы (швейныя) знаходзяцца поруч і мы спыняем сустрэчныя перавозкі і разгружаем чыгуначны транспарт. Наяўнасць буйнай электрастанцыі Белдрэса імя Сталіна забяспечыць камбінат у дастатковай ступені электраэнергіяй. Умацаваўшаяся мясцовая аршанская база «Саюззаготшэрсць», якая ўжо ў 1937 г. павінна нарыхтаваць па Беларусі каля 500 тон шэрсці, дае магчымасць выпускаць сукна не менш як 1,5 млн. метраў штогод з мясцовай сыравіны.

Апрача таго, разгрузіцца транспарт, так як гэта шэрсць зараз накіроўваецца на Паўночны Каўказ (Мервская мойка) і Украіну (Новая Баварыя), дзе яе прамываюць і адтуль зноў рассылаюць па фабрыках, у тым ліку назад у Беларусь. Патрэбна таксама памятаць, што ў трэцяй пяцігодцы аўпагадоўля атрымае вялікае развіццё, адсюль колькасць шэрсці намнога павялічваецца супроць 1937 года. Значыць, мясцовай сыравінай будучы камбінат будзе поўнасцю забяспечан.

Безумоўна, няма ніякай мэтазгоднасці ў далейшым укладаць капіталаўкладанні на суконную фабрыку ў Якаўлевічах, бо памяшканне вельмі старое (былая больніца), ужо ёсць у сценах вялікія шчыліны, а ў перакрыццях—вялікія згіны і т. д. Цеснота памяшкання не дае магчымасці не толькі дадаць абсталяванне, але і расставіць правільна тое, што ёсць, бо ўжо парушаны ўсякія нормы па ахове працы (адлегласць паміж машынамі 0,5 метра).

Паміж цэхамі існуе вялікая няўвязка. Выпуск прадукцыі апаратнага цэха на 70 проц. больш магутнасці прадзільнага цэха і т. д. Таксама малы аб'ём у выпуску гатовага тавару (240 тысяч метраў у год) даказвае аб невялікай эканамічнай эфектыўнасці фабрыкі.

Пабудова новага суконнага камбіната дасць магчымасць задаволіць узросшае запатрабаванне працоўных на шарсцяныя тавары, намнога будзе дэшавейшым сабекаштоўнасць гатовага тавару.

Г. Л. ЛОКШЫН.
Тэхнік Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі Наркамлегпрома БССР.

КАЛГАСНАЯ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

Касцюковічы. У калгасе «Чырвоны Кастрычнік» (Каніцкі сельсавет) распачалося будаўніцтва першай у раёне калгаснай гідраэлектрастанцыі.

На будаўніцтва гідраэлектрастанцыі СНК БССР адпусціў калгасу грашовую дапамогу ў суме 60 тысяч рублёў. Апрача гэтага адпушчан доўгатэрміновы крэдыт у суме 40 тыс. руб.

С. КУЦАЕЎ.

Стаханавец-каваль завода «Ударнік» (Менск) т. І. ФАЙБІШАЎ выконвае новыя нормы на 150—160 проц. НА ЗДЫМКУ: т. Файбішаў за работай ля пружыннага молата на коўцы балтоў для вагаў.

Фото Я. Салавейчыка.

НЕ ПРАВОДЗЯЦЬ АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ

Не праводзіцца ніякай антырэлігійнай прапаганды сярод працоўных Брагінскага раёна. Ячэйкі саюза ваяўнічых бязбожнікаў відзе не працуюць.

У гэты-ж час папы і царкоўнікі ў радзе месц імкнуцца праводзіць варожую агітацыю. Такі факт меў месца ў калгасе «Чырвоная Гара» нават сярод дзяцей. А ў Глухавіцкім сельсавеце царкоўнікі Шылец Ціхан і Бандарэнка Карп праводзяць яўна варожую агітацыю ў калгасе, каб падарваць яго знутры.

Адкрыта арудуюць у м. Брагіне папы Лысёнак і Чарняўскі, якія нават наладжваюць набажэнствы з агнём уначы па мястэчку. Як відаць, днём ім нялоўка рабіць свае брудныя справы.

Вынікам ажыўлення дзейнасці духоўнікаў з'яўляецца і тое, што знайшліся адзінкі, якіх яны апутваюць. Факт-жа, што нават комсамольцы Ціханенка і Капанок хрысцілі сваіх дзяцей у папа, а маладая дзяўчына Шкурка Ганна некалькі раз хадзіла ў царкву.

Усё гэта павінна было настаражыць раённыя арганізацыі, каб пашкавіцца, чым-жа займаюцца духоўнікі. Аднак, нічога не зрабілі ў гэтым напрамку ні райком партыі, ні райком комсамола і райвыканком. Відаць, што праводзіць антырэлігійную прапаганду яны не лічаць сваім абавязкам.

ПРОТЧАНКА.

ВОРАГІ РАЗБУРАЮЦЬ СТАРЭЙШЫ КАЛГАС

Калгас «Новы свет», Брагінскага раёна—адзін з старэйшых у БССР, існуе з 1921 года. Да 1935 года калгас быў перадавым у раёне. За гэтыя гады ён эканамічна ўмацаваўся і ператварыўся ў культурную гаспадарку. Менш, чым па 3 кілограма збожжа, 8 кілограмаў бульбы і па 1 рублю грошай на працадзень калгаснікі не атрымлівалі. У калгасе пабудавалі добры клуб, правялі электрычнасць, радыё. Сярод калгаснікаў сістэматычна праводзілася культурна-выхаваўчая работа, чыталіся лекцыі аграномамі, урачамі, ставіліся спектаклі і т. д. Такіх вынікаў калгас дабіўся дзякуючы аддаванасці яго кіраўнікоў калгаснаму ладу і калгаснай гаспадарцы. Так працякала жыццё ў калгасе «Новы свет» на працягу амаль 14 год.

У 1935 годзе, невядома па якіх прычынах, у калгасе пачалі мяняць кіраўнікоў. Даволі сказаць, што за год змянілася 4 старшыні, а колькі брыгадзіраў, то і не прыпомніць. Працоўная дысцыпліна запяпала. На пасады брыгадзіраў пралезлі злачынныя элементы, як Мароз і Камок, якія раней прыцягваліся да судовай адказнасці. У калгасе пачалося сістэматычнае раскрадання маемасці. На працягу восені і зімы мінулага года ў калгасе раскралі 700 пудоў розных прадуктаў. Уся салома згніла. Жывёле пасцілалі сена. Вясной не хапіла кармоў. Калі адкрылі бурты, пачалося сістэматычнае раскрадання бульбы. Старшыня калгаса Пікуль не толькі не рэагаваў на ўсе гэтыя злачынствы, а наадварот,—дапамагаў брыгадзірам Марозу і Камку рабіць свае брудныя справы.

Некаторыя калгаснікі прабавалі адкрыта выступаць супроць злачынцаў. Апошнія пачалі іх праследваць. У выніку — 8 гаспадарак выйшлі з калгаса.

Калгас «Новы свет» знаходзіцца на адлегласці 2 кілометраў ад раённага цэнтра. Не гледзячы на гэта, раённыя кіруючыя работнікі праходзілі міма ўсіх гэтых агідных фактаў і зусім не рэагавалі на падрыўную работу класавых ворагаў у калгасе.

СКАРАХОД, СЕДРЭНОК, ПАРАМОНІН.

ЗДЗЕКІ З ХВОРЫХ У ЛЕЗНЯНСКАЙ БОЛЬНІЦЫ

Партыя і ўрад аддаюць велізарную ўвагу совецкай жанчыне-маці. Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб забароне абортаў і дапамозе радзіхам ухвалена ўсімі працоўнымі і праводзіцца ў жыццё. Аднак гэта гістарычнае рашэнне партыі і ўрада ігнаруецца ў Лёзнянскім раёне.

18 сакавіка гэтага года мая жонка Вольга Бейс у лёзнянскай больніцы нарадзіла дачку. Роды прайшлі добра. Аднак, у радзільным аддзяленні было вельмі брудна і холадна. Праз некалькі дзён у жонкі пачалося крывяцячэнне і паднялася тэмпература. На працягу двух сутак хворая спякала крывёю. Загадчык больніцы Альсмік і акушэрка Свірская правялі злачынную раўнадушнасць да хворай, не аказаўшы ёй ніякай дапамогі.

Толькі праз два дні Свірская ў прысутнасці райздрава Бузвіча прынесла брудная рызэё і хацела падкласці пад хворую. Знаходзячыся амаль у беспрытомным стане, хворая ўсё-ж запратеставала.

Запрошаны мной з Віцебска праф. Кроль устанавіў, што хворую можна выратаваць, але патрэбен уважлівы догляд з боку медперсанала.

Што-ж зрабілі лёзнянскія ўрачы? У чарговы дзень адпачынку яны ўсе паехалі ў Віцебск, пакінуўшы больніцу на догляд ніжэйшага медперсанала. Санітары і сёстры проста здзекваліся з хворай. Лёд клалі ў дзіравы пузыр. Увесь ложак і бялізну залілі вадой.

Дзіця на працягу ўсяго часу аставалася без усякага догляду.

Не вытрымаўшы ўсіх гэтых здзекаў, хворая 30 сакавіка памерла.

Прашу пракуратуру рэспублікі ўмяшацца ў гэту справу і прыцягнуць да адказнасці злачынцаў.

ГЕОРГІЙ БЕЙС.

ПРА АДНО ДЗЯЛЯЦКАЕ РАШЭННЕ

Народны камісарыят аховы здароўя БССР вынес рашэнне аб перасяленні стаматалагічнай клінікі з Клінічнага гарадка ў памяшканне былога «Емсо» па Ленінскай вуліцы. На працягу двух год пытанне аб перасяленні не раз ставілася ў наркамаце. І вось, замест таго, каб сур'ёзна заняцца падшуканнем адпаведнага памяшкання для адзінай у рэспубліцы стаматалагічнай клінікі, апошнюю кідаюць у нягоднае, цеснае і цёмнае памяшканне. Гэта роўназначна згортванню ў значнай ступені работы клінікі і зрыву справы падрыхтоўкі кадраў. У наркамаце разважаюць так: Добра і тое, што хоць ёсць памяшканне, непрыгоднае для іншых мэт, для стаматалогіі падыйдзе.

Як назваць такія разважанні, калі не выключным дзяляцтвам!

Ці дапушчальна, каб сам Наркамат аховы здароўя, па сутнасці, развальваў вельмі карысную і неабходную працоўным установу, створаную з вялікімі цяжкасцямі?

Дацэнт Ю. МЕТЛІЦКІ.

АКРУГОВЫЯ СУДЫ І ІХ ЗАДАЧЫ

Сталінскай Канстытуцыяй СССР устаноўлена адзіная сістэма совецкага суда, якая складаецца з Вярхоўнага Суда Саюза ССР, Вярхоўных судоў саюзных і аўтаномных совецкіх рэспублік, судоў абласных і акруговых, участковых народных судоў і спецыяльных судоў, ствараемых па пастанове Вярхоўнага Совета СССР (арт. 102 Канстытуцыі СССР).

У БССР, у адпаведнасці з яе адміністрацыйным падзелам, рэспубліканская судовая сістэма Народнага Камісарыята Юстыцыі БССР складаецца з Вярхоўнага Суда, акруговых судоў у акругах і народных судоў у гарадах і раёнах (арт. 80 Канстытуцыі БССР).

Акруговыя суды ў БССР былі ліквідаваны ў 1930 годзе, пры ліквідацыі акруговага падзелу рэспублікі. Разгляд спраў, падсудных да таго часу акруговым судам, як судам 1-й інстанцыі, быў перадан у асноўным народным судам, а больш важных спраў — Вярхоўнаму суду. Разгляд спраў касацыйных (абскаржаных прыгавораў народных судоў) і ў парадку судовага нагляду быў перадан Вярхоўнаму суду. У 1936 годзе, пасля арганізацыі ў БССР Лепельскай, Мозырскай, Полацкай і Слуцкай округ у апошніх былі арганізаваны пастаянныя судова-касацыйныя сесіі Вярхоўнага Суда БССР. Апублікаванай 15 сакавіка 1937 года пастановай ЦВК БССР ад 5 сакавіка пастаянныя сесіі рэарганізаваны ў акруговыя суды.

Гэта рэарганізацыя мае вялікае палітычнае значэнне. Яна забяспечыць высокую якасць работы, якая патрэбна для выканання пастаўленых перад судовымі органамі Сталінскай Канстытуцыяй адказнейшых задач. Яна яшчэ больш паблізіць суд да насельніцтва і дапаможа ліквідаваць яшчэ не знішчаныя ў паасобных судовых органах рэшткі пяганіны і бюракратызма.

Перад усімі совецкімі судовымі органамі Сталінскай Канстытуцыяй пастаўлены адказнейшыя задачы: абарона социялістычнай радзімы ад наскокаў класавага ворага, умацаванне і ахова свяшчэннай социялістычнай уласнасці, ахова совецкага правапарадку, ахова асабістых і маёмасных правоў працоўных. Совецкі суд павінен сурова падаўляць супраціўленне класавага ворага і выхоўваць новае социялістычнае правасазнанне працоўных. Зусім зразумела, на якой высокай ступені павінна стаяць работа совецкага суда для паспяховага выканання гэтых задач.

Выданне законаў у галіне судаўстройства Канстытуцыі СССР (арт. 14 Канстытуцыі СССР) аднесена да кампетэнцыі саюзных законадаўчых органаў. Сталае «Палажэнне аб акруговых судах», якім павінны быць устаноўлены правы і абавязкі акруговых судоў, будзе выдана агульнасаюзнае — Вярхоўным Советам Саюза. Таму, уперад да выдання новага «Палажэння», акруговыя суды ў сваёй рабоце будуць кіравацца выданай 25 студзеня 1936 года пастановай ЦВК і СНК БССР «аб органах юстыцыі ў акругах».

Члены Вярхоўнага Суда і яго сесій, згодна Канстытуцыі, абіраюцца Вярхоўным Советам рэспублікі, а члены акруговых судоў абіраюцца акруговымі советамі дэпутатаў працоўных (Канстытуцыя БССР, арт. 84). Гэты парадак выбараў набліжае акруговыя суды да насельніцтва і ўводзіць іх у адзіную сістэму выбарных органаў акругі.

Акруговыя суды будуць разглядаць у якасці судоў першай інстанцыі ўсе ўзнікаючыя ў межах акругі крымінальныя справы, якія пры ўзнікненні ў неаб'яднаных у акругі раёнах падсудны Вярхоўнаму суду. Гэта справы аб злачынствах контррэволюцыйных і асабліва для Саюза ССР небяспечных злачынствах супроць парадку кіраўніцтва, апрача тых з іх, якія спецыяльнымі законамі аднесены да падсудасці спецыяльных судоў; справы аб службовых злачынствах тых асоб, якія займаюць кіруючыя пасады ў акруговых установах і членаў прэзідыумаў, загадчыкаў і намеснікаў загадчыкаў аддзелаў райвыканкомаў. Апрача таго, на разгляд акруговаму суду можа быць перадана любая крымінальная і грамадзянская справа Вярхоўным Судом ці Пракурорам Рэспублікі. Сам Акруговы суд мае права самастойна прыняць для свайго разгляду любую справу, падсудную народнаму суду, калі ён прызнае, што гэтым будзе дасягнут вялікі палітычны і выхаваўчы эфект прыгавору.

У якасці касацыйнай інстанцыі акруговыя суды будуць разглядаць усе скаргі на прыгавары народных судоў акругі па крымінальных справах і на іх рашэнні па грамадзянскіх справах.

Праз акруговыя суды будзе праходзіць вялікая колькасць судовых спраў першай інстанцыі — касацыйных, крымінальных і грамадзянскіх, глыбока закранаючых самыя жыццёвыя інтарэсы совецкай дзяржавы і гаспадаркі і совецкіх грамадзян.

У сувязі з шпаркім развіццём социялістычнай гаспадаркі, ростам матэрыяльнага добрабыту і культурных запатрабаванняў працоўных усё больш шырока разгортваецца грамадзянскі зварот, які патрабуе «стабільнасці законаў», устойлівасці грамадзянскіх праваадносін, строгай аховы асабістых і маёмасных правоў працоўных. Паралельна з ростам грамадзянскага звароту павялічваецца паступленне ў суды грамадзянскіх спраў, якія за апошні час у параўнанні з крымінальнымі займаюць усё больш пераважваючае месца.

Між тым, якасць работы народных судоў, асабліва па грамадзянскіх справах, да гэтага часу была недастаткова высокай, і акруговыя суды павінны звярнуць асаблівую ўвагу на выпраўленне практыкі нарсудоў па гэтых справах.

На совецкі суд ускладаецца высокі абавязак аховы гарантыраваных раздзелам VIII Сталінскай Канстытуцыі асноўных правоў грамадзян СССР. Адной з важнейшых задач суда ў гэтай галіне з'яўляецца задача правільнага, высокаякаснага вырашэння грамадзянскіх працоўных спраў і забеспячэння точнага выканання судовых рашэнняў па працоўных справах.

Сталінская Канстытуцыя і гістарычны закон ад 27 чэрвеня 1936 года аб забароне абортаў, устанаўленні дзяржаўнай дапамогі шматсямейным, павелічэнні размеру аліментаў на ўтрыманне дзяцей і т. д. абавязвае суды паставіць на недасяжную вышыню ахову правоў совецкай жанчыны і дзяцей. Асаблівую важнасць набывае своечасовы разгляд аліментных спраў, правільнае іх вырашэнне, забеспячэнне своечасовага і поўнага спагнання прысуджаных на ўтрыманне дзяцей сродкаў. Закон ад 27/VI-36 года ўмацаваў яшчэ больш упэўненасць жанчыны ў аховe яе правоў, у сувязі з чым колькасць і ўдзельная вага аліментных спраў у судах за апошні час значна павялічыліся.

Тысячам працоўных, якія за вырашэннем усіх гэтых важнейшых спраў звяртаюцца ў суд, не трэба будзе ехаць са скаргамі і для ўдзелу ў касацыйным разглядзе спраў у Вярхоўны суд — у Менск. Яны будуць звяртацца ў акруговыя суды, тэрытарыяльна да іх значна больш блізкія. Яшчэ больш палягчаецца такім чынам для працоўных абарона імі сваіх правоў. Разгаванне на скаргі працоўных і разгляд спраў паскараецца. Больш забяспечваецца вынясенне правільных, адпавядаючых закону і абставінам, прыгавораў і рашэнняў. Суд яшчэ больш набліжаецца да шырокіх працоўных мас.

У парадку судовага нагляду старшыня Акруговага суда мае права запатрабаваць любую справу нарсуда акругі і апратэставаць няправільна вынесены прыгавор або рашэнне. Апратэставаныя старшынёй акруговага суда прыгаворы і рашэнні разглядаюцца Вярхоўным Судом.

Як разглядам спраў у касацыйным парадку, так і разглядам іх у парадку судовага нагляду акруговы суд правярае якасць работы народных судоў, выпраўляе іх магчымыя памылкі, дае ім канкрэтныя ўказанні аб недачотах у іх рабоце.

Совецкі суд — адзіны ў свеце сапраўды дэмакратычны суд социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Социялістычны дэмакратызм совецкага суда забяспечваецца ўсім ладам совецкай дзяржавы, яе социялістычным, адпавядаючым інтарэсам шырокіх працоўных мас, законам. Социялістычны дэмакратызм совецкага суда забяспечваецца выбарнасцю народных судоў на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні і ўдзелам у разглядзе спраў роўна з сталым выбарным суддзёй таксама выбарных народных засядацеляў, ажыццяўляючых свае судовыя абавязкі па чарзе. (Канстытуцыя БССР, арт 81—85; праграма ВКП(б), арт. 11.).

Звыш 4000 народных засядацеляў абіраюцца і ажыццяўляюць судовыя абавязкі ў акругах. Прымаць актыўны ўдзел у разглядзе канкрэтных судовых спраў і вынясенні рашэнняў і прыгавораў, забяспечыць вынясенне палітычна і юрыдычна правільных рашэнняў і прыгавораў яны змогуць толькі тады, калі будуць азнаёмлены з асновамі совецкага права і працэса. Азнаямленне народных засядацеляў з асновамі совецкага права і працэса — адзін з важнейшых участкаў работы акруговых і народных судоў. Трэба прызнаць, што работа з нарзасядацелямі зараз праводзіцца НКЮ і нарсудамі зусім недастаткова; і акруговыя суды павінны гэту работу ў акругах наладзіць і ажывіць.

Акруговыя суды павінны ажыццяўляць праз народныя суды і непасрадна нагляд і кіраўніцтва работай грамадскіх судоў на тэрыторыі акругі (вытворча-таварыскіх, сельскіх і жакцтаўскіх судоў). У гэтай галі не акруговым судам належыць прарабіць вялікую работу, бо яшчэ да гэтага часу работа грамадскіх судоў, кіраўніцтва і дапамога ім з боку нарсудоў стаяць не на належнай вышыні.

У бліжэйшы час перад працоўнымі БССР стане ўпчыльную пытанне аб выбарах народных судоў (народных суддзяў і народных засядацеляў). Неабходна зараней падрыхтавацца да выбараў з тым, каб забяспечыць склад народных судоў, адпавядаючых пастаўленым перад судамі Сталінскай Канстытуцыяй задачам. Перад акруговымі судамі ва ўвесь рост паўстае адказнейшая палітычная задача — прыняць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы выбараў і дапамагчы тым грамадскім арганізацыям і таварыствам працоўных, якім Сталінскай Канстытуцыяй прадастаўлена права выстаўлення кандыдатур на выбарах (арт. 116 Канстытуцыі БССР). Неабходна зараз-жа арганізаваць пастаноўку адчотных дакладаў народных суддзяў аб іх рабоце перад выбаршчыкамі, а таксама перад совецкімі кіруючымі органамі; выявіць дастойных таварышоў, якія сваёй работай даказалі сваю адданасць справе партыі Леніна — Сталіна, даказалі, што яны дастойны высокага звання совецкага суддзі.

Задачы, якія стаяць перад акруговымі судамі, надзвычайна вялікія і складаныя. Ад работнікаў акруговых судоў патрабуецца ў іх рабоце высокая класавая пільнасць, адданасць справе будаўніцтва социялізма, непахіснасць у правядзенні палітыкі партыі Леніна — Сталіна, паслядоўнасць у правядзенні і аховe совецкіх законаў. Акруговыя суды павінны моцна ўлічыць і добра запомніць урок лепельскай справы, дзе прытупленне класавай пільнасці з боку акруговых і раённых работнікаў, у тым ліку работнікаў органаў юстыцыі, прывяло да грубейшых парушэнняў рэволюцыйнай законнасці, ліўшых ваду на млын класавага ворага. Нельга ні на адну мінуту забываць важнейшага ўказання В. І. Леніна аб тым, што «малейшае беззаконне, малейшае парушэнне совецкага парадку ёсць ужо дзіра, якую зараз-жа скарыстаюць ворагі працоўных».

Сталінская Канстытуцыя, устанаўляючы выбарнасць судоў усім насельніцтвам, незалежнасць суддзяў і падпарадкаванасць іх пры разглядзе і вырашэнні судовых спраў толькі закону, стварае найлепшыя ўмовы для работы совецкага суда. Ад работнікаў акруговых і народных судоў, ад іх адданасці справе залежыць пастаноўка судовай работы на вышыню, адпавядаючую стаячым перад імі адказнейшым задачам.

МУЛЯРЧЫК, АПРЭЛЕЎ.

ЗА РУБЯЖОМ

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

19 мая на працягу ўсяго дня каля 60 самалётаў інтэрвентаў бамбардыравалі горад Мунгія (на поўнач ад Більбао) і ўмацаваныя пазіцыі на гары Хата (на паўночны ўсход ад Більбао).

Пасля паветранай бамбардыроўкі і артылерыйскай стральбы войскі мяцежнікаў і італьянская брыгада «чорныя стрэлы» прадпрынялі атаку на рэспубліканскія пазіцыі, разлічваючы сустрэць слабае супраціўленне з боку рэспубліканцаў. Аднак, баскскія войскі, заняўшы выгадныя пазіцыі, сустрэлі праціўніка моцным кулямётным і вінтовачным агнём. Такога энергічнага адпору італьянскія войскі не чакалі і адступілі ад Мунгіі, панёсшы вялікія страты, яны ўцяклі на свае зыходныя пазіцыі.

Авіяцыя мяцежнікаў і інтэрвентаў штодзень робіць свае злачынныя налёты на мірныя пасёлкі. Учора самалёты праціўніка скінулі некалькі дзесяткаў бомб на паселішча Гальдакано (на паўднёвы ўсход ад Більбао), разбурыўшы шмат дамоў. Ёсць шмат забітых і раненых жанчын і дзяцей.

Авіяцыя інтэрвентаў зрабіла таксама налёт на Більбао і бамбардыравала горад, не прычыніўшы яму, аднак, вялікай шкоды.

На ўчастку Ла Мата (на поўнач ад Леона) астурыйскія гарнякі з боем прасоўваюцца наперад у напрамку к гораду Леону. 19 мая рэспубліканцы, скарыстаўшы цемнату і рэльеф мясцовасці, нечакана для мяцежнікаў акружылі мястэчка Ла Весілья (на паўночны ўсход ад Леона) і прыступілі да ўмацавання занятых пазіцый.

ТЭЛЕГРАМА ІСПАНСКАГА УРАДА ЛІГЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі — месца-прабыванне Лігі нацый), 20 мая. (БЕЛТА). Генеральны сакратар Лігі нацый Авеноль атрымаў ад іспанскага ўрада тэлеграму наступнага зместу:

Паводле патрабавання іспанскага ўрада Совет Лігі нацый склікаў у снежні 1936 года надзвычайную сесію для абмеркавання, на аснове 11 артыкула статута Лігі, становішча, якое стварылася ў рэзультаце інтэрвенцыі ў Іспаніі некаторых дзяржаў.

Карыстаючыся выпадкам, урад рашуча заяўляе, што рэзалюцыя, прынятая Советам Лігі нацый на пасяджэнні ад 12 снежня, не вычарпала пытання, якое абмяркоўвалася: іспанскі ўрад захаваў за сабой права ў выпадку, калі гэтага патрэбуе абстаноўка, зноў паставіць перад Советам Лігі нацый гэта пытанне.

Далейшае развіццё замежнай інтэрвенцыі ў Іспаніі,—гаворыцца ў тэлеграме, — прыняло пасля вынясення ўказанай рэзалюцыі такія размеры, што неабходна ўмяшанне Совета Лігі нацый. У гэтых мэтах іспанскі ўрад просіць унесці памянёнае пытанне ў парадак дня чарговай сесіі Совета Лігі нацый. Тэлеграма падпісана міністрам замежных спраў Іспаніі Хіралем і датавана 19 маем.

У адпаведнасці з патрабаваннем, якое змяшчаецца ў тэлеграме, генеральны сакратар Лігі нацый унёс зварот іспанскага ўрада ў павестку дня чарговай сесіі Совета Лігі нацый, якая адкрываецца 24 мая.

ІСПАНСКІ НАРОД ПАДТРЫМЛІВАЕ НОВЫ УРАД

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 20 мая. (БЕЛТА). Газета «Эль сосіяліста» ўказвае, што значны лік прафсаюзных арганізацый, якія ўваходзяць ва ўсеагульны рабочы саюз, выказаўся за падтрымане новага ўрада. «Сапраўдныя пролетарскія прадстаўнікі, — піша «Эль сосіяліста», — рашуча падтрымліваюць новы габінет».

«Фрэнтэ рохо», орган комуністычнай партыі, які выходзіць у Валенсіі, друкуе атрыманы ад шматлікіх прафсаюзаў, што ўваходзяць ва ўсеагульны рабочы саюз, тэлеграмы, у якіх гэтыя арганізацыі салідарызуюцца з новым урадам народнага фронта. Надзвычайны сход прадстаўнікоў прафсаюзных арганізацый, якія прымаюць удзел у кіраванні мадрыдскім народным домам «Каса дэль Пуэбло» (магутная культурная арганізацыя ўсеагульнага рабочага саюза), пастанавіў аказваць новаму ўраду ўсякае падтрыманне.

Правінцыяльныя аб'яднанні ўсеагульнага рабочага саюза ў Астурыі, Сантандэры і краіне баскаў прынялі ўчора рэзалюцыю, якая асуджае адмоўную пазіцыю, занятую выканкомам ўсеагульнага рабочага саюза ў адносінах да новага ўрада.

Мадрыдскі камітэт аб'яднаных сацыялістычнай моладзі выпусціў спецыяльны зварот, які вітае новы ўрад.

«Толькі фашысты, трацкісты і бескантрольныя элементы, — указваецца ў звароце, — могуць быць супроць новага ўрада народнага фронта».

Мерапрыемствы новага іспанскага ўрада

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 мая. (БЕЛТА). Згодна паведамлення з Валенсіі, Эрнандэс — міністр народнай асветы і аховы здароўя — заявіў журналістам: «Пасля сваёй дэкларацыі ў совеце міністраў старшыня совета міністраў Негрын зазначыў, што ўнутранае становішча з пункту гледжання грамадскага парадку, з'яўляецца здавальняючым. Урад не пацерпіць ні малейшых парушэнняў спакою ў тылу. Адкрыццё парламента адбудзецца ў пачатку чэрвеня.

Совет міністраў пастанавіў, што серабро і дэвізы павінны быць зданы ў банкі ў абмен на папяровыя грошы. Усякае хаванне валюты будзе разглядацца як кантрабанда».

ПРАЦОЎНЫЯ ФРАНЦЫІ ДАПАМАГАЮЦЬ БАСКАМ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 мая. (БЕЛТА). Старшыня камітэта дапамогі на сельніцтву Більбао комуніст Вайян Кутур'е быў прыняты дырэктарам габінета совета міністраў Блюмелем. Блюмель запэўніў Вайяна Кутур'е ў тым, што ўрад акажа камітэту поўную садзейнасць. Суднам, якія вязуць харчаванне ў Більбао, і прадназначаны для эвакуацыі дзяцей з Більбао, будзе таксама забяспечана абарона французскага ваеннага флота. Згодна вестак друку, камітэт дапамогі Більбао сабраў за кароткі час 300 тыс. франкаў і дзесяткі тон медыкаментаў і прадуктаў.

Як паведамляе орган компартыі «Юманітэ», камітэт народнай дапамогі ва Францыі (былы МОПР) атрымаў ад старшыні совета міністраў Блюма дазвол арганізаваць «Дзень салідарнасці з іспанскім народам». Камітэт народнай дапамогі звярнуўся з заклікам да французскага народу аказаць дапамогу баскам.

НАПЯРЭДАДНІ АДКРЫЦЦЯ МІЖНАРОДНАЙ ПАРЫЖСКАЙ ВЫСТАЎКІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 мая. (БЕЛТА). Учора з будаўніцтвам сусветнай парыжскай выстаўкі 1937 г. і з совецкім павільёнам на гэтай выстаўцы знаёміўся прыехаўшы ў Парыж народны камісар замежных спраў СССР тав. Літвінаў, якога суправаджалі прыбыўшыя ў Парыж генеральны камісар совецкай часткі выстаўкі тав. І. І. Межлаук і паверанны ў справах СССР ва Францыі тав. Гіршфельд.

У совецкім павільёне круглыя суткі ідуць работы па размяшчэнню прыбыўшых з Масквы экспанатаў. Прыбыла, як вядома, 9 вагонаў з экспанатамі. Чакаецца прыбыццё астатніх 17 вагонаў.

КАНФЛІКТ ПАМІЖ ЯПОНСКАЙ ГРАМАДСКАСЦЮ І УРАДАМ

ХАЯСІ НЕ ЖАДАЕ ЎЙСЦІ Ў АДСТАЎКУ

ТОКІО (сталіца Японіі), 20 мая. (БЕЛТА). Учора глава ўрада Хаясі зрабіў новую заяву японскім журналістам, у якой паўтарыў свае ранейшыя нападкі на палітычныя партыі, дадаўшы, што ён астаецца ва ўладзе, займаючы «ролю суддзі паміж радыкальным нацыяналізмам і скажоным лібералізмам з мэтай забеспячэння належнага развіцця канстытуцыйнай палітыкі, уласцівай толькі Японіі».

Некаторыя газеты адзначаюць, што ўсе спробы Хаясі запоўніць вакантныя месцы ў габінеце аказаліся дарэмнымі, бо ўсе дзеячы, якім Хаясі прапанаваў міністэрскія партфелі, адказалі адмаўленнем, не жадаючы звязваць свой палітычны лёс з лёсам вельмі няўстойлівага ўрада Хаясі.

ВАЕННА-МОРСКІ ПАРАД У СПІТХЭДЗЕ

ПОРТСМУТ (порт у Англіі), 20 мая. (БЕЛТА). Сёння ў Спітхэдзе адбыўся ваенна-морскі парад з прычыны каранацыі караля. На барту каралеўскай яхты кароль сёння прымаў замежных і англійскіх адмі-ралаў, а таксама камандзіра лінкора «Марат», флагмана 2-га ранга тав. В. Іванова.

Паўпрэд СССР у Вялікабрытаніі тав. Майскі знаходзіўся ў ліку гасцей англійскага ўрада на барту лінкора «Стратмор», суправаджаўшага разам з чатырма іншымі лінкорамі каралеўскую яхту, на якой кароль прымаў парад.

МАЛАДЫЯ КАНСТРУКТАРЫ. НА ЗДЫМКУ: дзеці дзіцячага сада № 49 у Бабруйску Гога Далінскі і Нома Рынкоў за складаннем дэталей «канструктара».

Фото Кавалерчыка (БСФ).

АРГАНІЗАВАЦЬ НАРМАЛЬНЫ ГАНДАЛЬ МАЛАКОМ

У майскія дні ў менскіх магазінах значна павялічылася колькасць малака. Але попыт спажыўца яшчэ далёка не забяспечан. У магазінах штодзень у сярэднім прадаецца каля 8.000 літраў, замест патрэбнасці ў 15—18 тыс. літраў малака. Менскі малочны завод недадае гандлюючым арганізацыям малака таму, што Менскі і Смалявіцкі раёны зрываюць план паставак малака. За 4 месяцы гэтага года яны недадалі заводу каля 881 тоны. У апошні-ж час яны кожны дзень павінны даваць 28 тыс. літраў, а даюць 19—20 тыс. літраў.

На базарах гандаль малаком таксама не арганізован. Вядома, што зараз праходзіць пасеўная кампанія, калгаснікі і аднаасобнікі раёна, занятыя на палявых работах, мала прывозяць малака ў горад. Усе базары Менска штодзень прадаюць не больш 2000—4000 літраў малака, што вельмі мала задавальняе патрэбы насельніцтва горада.

Жыхары ўскраін горада — Старажоўкі, Камароўкі, Выстаўкі і інш. вымушаны ў пошуках малака хадзіць за 4—5 кілометраў на Чэрвеньскі, Крыты, Суражскі, Юбілейны рынкі.

Што-ж робяць Горунутгандаль (загадчык Саф'ян) і Белхарчгандаль (дырэктар Флегр) для арганізацыі нармальнага гандлю малаком як у магазінах, так і на рынках? Нічога. Яны абсалютна нічога не зрабілі, каб наладзіць гандаль малаком у горадзе. А ці нельга было апрача дагавору з малочным заводам, заключыць таксама дагавары з прыгараднымі калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі на куплю ў іх малака і на сваіх машынах дастаўляць непасрэдна ў магазіны? Безумоўна, можна. Але тут ніяк не дадумаюцца гэта зрабіць, бо мала клапоцяцца аб спажыўцу.

Гарадскі совет (старшыня т. Жуковіч) не толькі не кантралюе работу гандлюючых арганізацый, але сам не выконвае рашэння бюро гаркома партыі ад 5 студзеня г. г. аб будаўніцтве ў Менску 5 новых павільёнаў для продажу малака. Гандаль малаком на Камароўскім рынку горсовет чамусьці зусім забараніў.

Горсовет і гандлюючыя арганізацыі аказаліся бездапаможнымі ў арганізацыі гандлю такім прадуктам першай неабходнасці, як малаком.

В. АСТРОЎСКІ.

НОВЫЯ ПОСПЕХІ ГЛУСКІХ СПЛАЎШЧЫКАЎ

З пачатку сёлетняй навігацыі сплаўшчыкі Глускага падучастка разгарнулі паміж сабой сацыялістычнае спаборніцтва на датэрміновае і безаварыйнае правядзенне сплаву. Свае словы яны стрымліваюць.

Спаборнічаючыя брыгады тт. Пігулеўскага і Варавы дабіліся новых стаханаўскіх поспехаў у сваёй рабоце. Першая брыгада па плытнаму сплаву штодзенна ў сярэднім дае выпрацоўку на 420 проц., другая, — на 360 проц. Не адстаюць у рабоце і іншыя брыгады.

Сплаўшчыкі брыгады тав. Стральчэні па р. Пціч давялі выпрацоўку на кожнага да 280 проц. На чатыры дні раней тэрміну яны даставілі лес на р. Прыпяць. Брыгада т. Пацая штодзень выконвае свой план на 360 проц. Брыгада т. Лапіцкай па загатоўцы рэквізіту квартальны план выканала на 170 проц. У апошнія дні яна давяла выпрацоўку да 350 шт., замест нормы ў 120.

КУЛІК.

ПРУДАВЫЯ ГАСПАДАРКІ КАЛГАСАЎ

На развіццё прудавых гаспадарак па гадоўлі рыбы ў радзе калгасаў рэспублікі Соўнарком БССР адпускае 200 тысяч рублёў. У калгасе «Чырвоная зорка», Смалявіцкага раёна, арганізуецца вялікая рыбна-прудная гаспадарка. Гаспадарка штогод дасць 6.750 кілограм рыбы. Адпушчаны крэдыты на арганізацыю рыбных прудоў у калгасах «Прагрэс» і «Памяць Леніна», Уздзенскага раёна, і ў 5 калгасах Буда-Кашалёўскага раёна. Рад калгасаў Даманавіцкага, Мсціслаўскага і інш. раёнаў таксама падалі заяўкі на арганізацыю ў сябе рыбнай гаспадаркі.

ЦАГЕЛЬНЫЯ, ЧАРАПІЧНЫЯ І ВАПНЯНЫЯ ЗАВОДЫ Ў КАЛГАСАХ

У 1936 г. у калгасах БССР пабудавана 219 цагельных заводаў, 5 чарапічных і 30 вапняных. На развіццё гэтых відаў прамысловасці ў калгасах у гэтым годзе адпушчана 4 мільён 900 тысяч рублёў. Будуць пабудаваны 375 цагельных заводаў, кожны з якіх разлічан на штогодні выпуск 120 тысяч штук цаглін, 300 чарапічных заводаў, кожны з выпускам 60 тысяч штук чарапіц у год і 75 вапняных заводаў. У калгасах імя Войкава, Менскага раёна і «Новае жыццё», Барысаўскага раёна, пабудаваны ўжо вопытныя кольцавыя печы для абпалу цэглы.

„ФАРПОСТ ВЯЛІКАЙ РАДЗІМЫ"

У Менск прыехалі рэжысеры Белдзяржкіно тт. Шмітгоф і Гаўронскі — аўтары карціны «Канцэрт Бетховена». Яны прыступаюць да пастаноўкі вялікай гукавой мастацка-дакументальнай карціны «Фарпост вялікай радзімы», якая прысвячаецца дваццацігоддзю Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

Новая карціна па сваіх задачах павінна адлюстраваць росквіт БССР. Яна ахопіць розанастайныя бакі жыцця і быту рэспублікі, пакажа на экране асобныя галіны сельскай гаспадаркі, прамысловасці, культуры і фальклор БССР.

Уся музыкальная частка фільма будзе пабудавана на нацыянальных беларускіх песнях і танцавальных мелодыях, якія будуць апрацоўвацца пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў ордэнаносца Дунаеўскага. У фільме шырока будуць выкарыстаны вершы, песні, музыка. У аб'екты здымак, да якіх хутка прыступяць, уваходзяць буйнейшыя фабрыкі, заводы, соўгасы, культурныя і навуковыя ўстановы рэспублікі.

КЛОПАТЫ КАЛЕКТЫВА АБ ДЗЕЦЯХ КАЛГАСНІКА

ЖЛОБІН, 21 мая. (БЕЛТА). Нядаўна раптоўна памёр старшыня буйнейшага і старэйшага ў раёне інтэрнацыянальнага калгаса «Эрштэр май» тав. Рэўзін. Яго любілі калгаснікі за чулыя адносіны да людзей, за ўмелае кіраўніцтва гаспадаркай.

Пасля смерці тав. Рэўзіна ў яго сям'і асталося пяцёра малых дзяцей. На сваім агульным сходзе калгаснікі вынеслі рашэнне: кожны год да поўналецця ўсіх дзяцей Рэўзіна налічваць яго сям'і 730 працадзён (такую колькасць працадзён атрымліваў тав. Рэўзін, працуючы ў калгасе) і выдаць сям'і былога старшыні аднаразовую дапамогу ў суме 1000 рублёў.

НА ПРАКТЫКУ Ў ДЗЯРЖАЎНЫ ЗАПАВЕДНІК

Багатая і рознастайная фауна (жывёльны свет) Беларускага дзяржаўнага запаведніка да гэтых пор не выкарыстоўвалася ў якасці практычных наглядных дапаможнікаў для студэнтаў адпаведных факультэтаў БДУ і інстытутаў. Толькі ў гэтым годзе ўпершыню 16 студэнтаў IV курса заалагічнага аддзялення БДУ выехалі на практыку ў дзяржаўны запаведнік. У запаведніку яны азнаёмяцца з жывёльным светам у натуральнай абстаноўцы, зробяць збор калекцый, правядуць складанне карт па рассяленню жывёл і наглядання над паводзінамі жывёл (бобра, куніцы, дзікай казы, лося) у няволі.

УСЕСАЮЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА БОКСУ У МЕНСКУ

Пачаўся розыгрыш асабістага пяршынства краіны па боксу. У Ленінградзе, Маскве і Тбілісі праведзен першы круг спаборніцтваў. Другі круг усесаюзнага пяршынства адбудзецца 30 мая ў Менску і Ерэване.

У Менску на рынгу сустрэнуцца 12 пар мацнейшых баксёраў Саюза пяці гадавых катэгорый. У найлягчэйшай вазе будуць баксіраваць: Берыеў (Тбілісі) — Сегаловіч (Харкаў), Ятцэраў (Петразаводск) — Цыганкоў (Менск). У лягчэйшай вазе: Сероў (Ленінград)—Горгаслідзе (Тбілісі), чэмпіён СССР лягчэйшай вагі Каюраў (Баку) — Заслаўскі (Харкаў). У лёгкай вазе: Штэйн (Масква)—Сцепаненка (Растоў-на-Дану), Васільеў (Ленінград)—Клімаў (Іванава), Саланічэнка (Харкаў) — Коган (Менск). У поўсярэдняй вазе: Чэрняеў (Ленінград) — Барышаў (Баку), Фурман (Одэса) — Цімафееў (Ленінград). У сярэдняй вазе: Загаруйчэнка (Ленінград) — Ашумаў (Баку), Кітасаў (Баку) — Бірк (Масква), Бакрадзе (Тбілісі) — чэмпіён СССР у сярэдняй вазе Чудзінаў (Масква).

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Дзеннік

— Нарада сакратароў парткомаў, парторгаў пярвічных партарганізацый і старшынь фабзаўмясцкомаў (комуністаў) Сталінскага раёна па пытанню: «Рашэнні VI пленума ВЦСПС аб перабудове профработы» адбудзецца 22 мая ў 7 гадзін вечара ў вялікай зале клуба металістаў (вул. Кірава).

— Нарада сакратароў парткомаў, парторгаў, старшынь фабзаўкомаў і мясцкомаў Варашылаўскага раёна адбудзецца 22 мая ў 7 гадзін вечара ў памяшканні клуба электрастанцыі (Совецкая, 110).

БЮРО абслугоўвання спажыўцоў электраэнергіі УСП

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА АБАНЕНТАЎ, ЯКІЯ ЗДАЛІ ДА 6 МАЯ ДЛЯ ПРАВЕРКІ

электрашчотчыкі

ШТО ЯНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АТРЫМАНЫ ДА 27 МАЯ.

Не атрыманыя шчотчыкі будуць ЗДАНЫ Ў СКЛАД УСП.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

БЕЛДЗЯРЖКІНО тэрмінова патрабуюцца ШОФЕРЫ для работы на палутарках.

Звяртацца з 9 да 3 г. дня— Совецкая, 90, другі паверх, пакой № 13, Белдзяржкіно.

МЯНЯЮ пакой 22 кв. м. у цэнтры на 2 пакоі або адзін большы. Даведацца з 9 да 4 гадзін дня па тэлефону 23-786 і з 5 да 9 гадзін вечара — 23-255.

Я АБМЯНЯЎ свае аблігацыі

А ты?

25 МАЯ ПЕРШЫ ТЫРАЖ ВЫИГРЫШАЎ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)

АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ АБМЯНЯЛІ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙ ВЫПУШЧАНЫХ МАСАВЫХ ДЗЯРЖПАЗЫК НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (ВЫПУСК 4 ГОДА) У АРГАНІЗАВАНЫМ ПАРАДКУ, МОГУЦЬ АБМЯНЯЦЬ ІХ ВА ЎСІХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ, РАЁННЫХ АШЧАДКАСАХ І АШЧАДКАСАХ ПЕРШАГА РАЗРАДА.

АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ АБМЯНЯЛІ СВАЕ АБЛІГАЦЫІ, ТРАЦЯЦЬ ПРАВА НА ЎДЗЕЛ У ПЕРШЫМ ТЫРАЖЫ ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (ВЫПУСК 4 ГОДА), ЯКІ НАЗНАЧАН НА 25 МАЯ Ў МАСКВЕ.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

КОГИЗ Бел. аддзял.

ПРАДАВАЙЦЕ СКАРЫСТАНЫЯ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ

Да ўвагі БАЦЬКОЎ школьнікаў.

Вашы дзеці перайшлі ў другія класы сваёй школы. У вашых дзяцей асталіся старыя, скарыстаныя падручнікі, непатрэбныя больш ім, але неабходныя вучням малодшых класаў.

ПРАДАВАЙЦЕ гэтыя падручнікі кніжным магазінам і кіёскам КОГИЗ'а па ўстаноўленай расцэнцы.

ЗАПОМНІЦЕ!

УСЕ МАГАЗІНЫ І КІЁСКІ КОГИЗ'а КУПЛЯЮЦЬ І ПРАДАЮЦЬ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР (БДДТ) 22 мая Абан. № 114. СКУПЫ

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра — БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА 22 мая Абан. № 44 ЕЎГЕНІЙ ОНЕГІН

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» ТРЫНАЦЦАЦЬ на летняй эстрадзе — канцэрт. адда.

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» АЛМАС на летняй эстрадзе — джаз-аркестр

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» «ПЕТЭР»

Гукавы кінатэатр «Спартак» ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ ПЕТРА ВІНАГРАДАВА

БЕЛДЗЯРЖКІНО даводзіць да ведама арганізацый, клубаў і школ, што ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ ГУКА-КІНОПЕРАСОЎКІ разлічаныя на аўдыторыю да 275—300 глядачоў. ПРЫМАЮЦЦА таксама заяўкі на ўстаноўку кіногукавой апаратуры стацыянарнага тыпу. Звяртацца: Менск, Совецкая, 90, пакой № 3. БЕЛДЗЯРЖКІНО.

На падставе загада НККГ БССР за № 60 ад 27 сакавіка 1937 г. і Энергакіраўніцтва НККГ БССР за № 49 ад 7 красавіка 1937 г. Менскі ЭНЕРГАКАМБІНАТ з 1 красавіка 1937 г. ЛІКВІДАВАН.

Установы і асобы, якія маюць ПРЭТЭНЗІІ да энергакамбіната павінны прад'явіць іх ліквідацыйнай камісіі да 15 чэрвеня 1937 г.

Пасля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі разглядацца і задавальняцца НЕ БУДУЦЬ.

Адрас ліквідкома: Менск, Совецкая, 110, Менэнергакамбінат. Разліковы рахунак у Белканторы Дзяржбанка № 150144. ЛІКВІДКОМ.

Прадаюцца ВАЛЬЦЫ ДЛЯ ВЫРАБУ ШТУЧНАЙ ВАШЧЫНЫ З УСІМІ ПРЫЛАДАМІ. Спрачацца: Менск, вул. Куйбышэва, 30, пчалярная арцель.

РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ» патрэбны машыністкі на дзённую і вячэрнюю работу. Звяртацца па тэл. № 20-830, ці непасрэдна ў сакратарыят (трэці паверх).

ДА ЎВАГІ АБАНЕНТАЎ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

З 1 ЧЭРВЕНЯ плата за электраэнергію АД АБАНЕНТАЎ БУДЗЕ ПРЫМАЦЦА ШТОДЗЕННА з 11 гадзін раніцы да 6 гадзін вечара, АПРАЧА АГУЛЬНА-ВЫХОДНЫХ ДЗЁН (6, 12, 18, 24 і 30).

Абаненты, якія часова выбываюць з Менска (на дачы, лагеры і т. д.) АБАВЯЗАНЫ ДАВЕСЦІ аб гэтым да ведама аддзел абанентаў кіраўніцтва сецей і падстанцый (Совецкая, 110).

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПЛАНАВА-ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ НКЗ БССР даводзіць да ведама райза, МТС, РКШ і інш. арганізацый, што ЗАБЯСПЕЧАННЕ кнігамі і бланкамі калгаснай дакументацыі ўсіх калгасаў БССР на падставе пастановы СНК СССР № 2050 ад 11 верасня 1935 г. і распараджэння Наркамзема СССР № 205/32 ад 3 лістапада 1936 г. ПЕРАДАНА Беларускаму аддзяленню „СОЮЗОРГУЧЕТ".

У сувязі з гэтым спецыяльны рахунак Наркамзема па разліках з райза, МТС, РКШ за гэту дакументацыю з 1 чэрвеня г. г. закрываецца. Усе прэтэнзіі па разліках за кнігі і бланкі калгаснай дакументацыі будуць прымацца да 1 чэрвеня 1937 г. Пасля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі па ўзаемных разліках прымацца не будуць.

Планава-фінансавы аддзел НКЗ БССР.

Уп. Галоўлітбела № К—2104. Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., К., С.